# Раздзел 4. СЦЭНАРНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС[1]

*Брэсцкая вобласць*

Мотальскі сельскі Дом культуры

## ТОРЖЕСТВЕННАЯ ЦЕРЕМОНИЯ ВРУЧЕНИЯ ПАСПОРТОВ «МЫ — ГРАЖДАНЕ БЕЛАРУСИ»

Составитель *О.Г. Кульбеда*

Худ. руководитель *Т.С. Супрун*

Действующие лица:

Ведущие, Чтецы, Учащиеся

**Ведущий 1**. Добрый день, дорогие друзья! Мы приветствуем вас в уютном зале Мотольского сельского Дома культуры.

**Ведущий 2**. В торжественной церемонии вручения молодым жителям агрогородка Мотоль главного документа гражданина страны — паспорта Республики Беларусь — принимают участие государственные деятели, представители общественных организаций, гости, ветераны Великой Отечественной войны.

**Ведущий 1**. Хорошей традицией стало проведение Всебелорусской акции «Мы — граждане Республики Беларусь!». Вот уже девятый год, в преддверии Дня Конституции Республики Беларусь по всей стране проходят торжественные встречи, на которых юным белорусам вручаются паспорта.

**Ведущий 2**. «Гражданин Республики Беларусь?» — эти слова каждый из нас произносит с гордостью и трепетом в сердце. Любовь к родной стране, уважение к истории и традициям народа, верность героическому подвигу наших дедов являются объединяющей силой для всех граждан нашей республики.

**Ведущий 1**. С радостью представляем наших гостей.

[1] Сцэнарна-метадычны комплекс падрыхтаваны на аснове матэрыялаў Рэспубліканскага агляду-конкурсу на лепшую арганізацыю работы клубных установаў аграгарадкоў «Клуб года».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Ведущий 2**. Для открытия торжественной церемонии «Мы — граждане Беларуси» приглашается…

Вступительное слово, торжественное открытие.

Звучит Государственный гимн Республики Беларусь.

**1-й чтец**.

Одна земля вскормила нас с тобою
И принесла нам солнечные сны.
Мы, как подарок, унесем с собою
Ее пригорки, пашни, валуны.
Тот ранний луч, который жадно ловим, —
Лишь малый отблеск праздничной красы
Лесов, колосьев золотоголовых,
Родных садов и луговой росы.
А весной в сквозном лесу тенистом
Мы приникаем к пламени рябин...
Вскормила и вспоила нас с тобою
Одна и та же щедрая земля.
Давайте ж вместе унесем с собою
Ее пригорки, чащи и поля.

Музыкальный номер.

**Ведущий 1**. Быть гражданином своей страны и достойным сыном Отечества — почетно. Это значит с юных лет трудиться, овладевать знаниями, укреплять здоровье, почитать родителей, уважать старших.

**Ведущий 2**. Каждый четвертый житель Ивановщины — молодой гражданин в возрасте от 14 лет до 31 года. Сегодня молодое поколение — это мощная сила, которая способна участвовать в построении суверенной, сильной и процветающей Беларуси.

**Ведущий 1**. Защита интересов молодежи — одно из приоритетных направлений государственной политики. Гарантированное рабочее место, жилищная программа, специальные фонды поддержки талантливой молодежи — звенья сформированной системы поддержки молодых людей со стороны государства.

**Ведущий 2**. Надеемся, что именно вы — молодые представители Ивановского района — будете стоять в первых рядах становления новейшей истории нашего государства.

**Ведущий 1**. Слово для приветствия предоставляется…

Выступление.
Музыкальный номер.

**Ведущий 2**. Все граждане Республики Беларусь в ответе за сегодняшний день и будущее своей страны!



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А будущее каждой нации и человечества в целом зависит от поколения, которое уже сегодня готово внести свой вклад в процветание родины. Сегодня, получая паспорт, вы становитесь полноправными гражданами Республики Беларусь со всеми прописанными в Конституции правами и обязанностями.

Но прежде, чем начнется церемония вручения паспортов, давайте окунемся в историю его возникновения.

**Ведущий 1**. Знаете ли вы, откуда произошло слово «паспорт» и что означает?

**Ведущий 2**. Слово «паспорт» французского происхождения. Буквальный перевод на русский язык означает «пропуск». Пропуска служили для беспрепятственного передвижения через границу.

**Ведущий 1**. А паспортная система впервые появилась в XV веке в Германии. Позднее она введена была во Франции и ряде других стран.

**Ведущий 2**. В Российской империи (белорусские земли входили в ее состав) паспорта использовались только в области международных связей и назывались проезжей грамотой. В XIX веке паспортная система стала единой. Она вводилась как средство укрепления порядка.

**Ведущий 1**. Великая Октябрьская революция отменила все законы Российской империи и акты Временного правительства, регламентировавшие паспортный режим. В первые годы Советской власти паспортная система не вводилась.

**Ведущий 2**. Отсутствие единого, обязательного для всех граждан документа, удостоверяющего личность, затрудняло учет населения, его передвижения, что привело к нарушениям прав граждан. Поэтому в декабре 1932 года утверждено «Положение о паспортах в СССР» и введена единая паспортная система.

**Ведущий 1**. Согласно Положению о паспортах, все граждане в СССР в возрасте от 16 лет, постоянно проживающие в городах и рабочих поселках, обязаны иметь паспорт, являющийся единственным документом, удостоверяющим личность гражданина. За нарушение паспортной системы граждане несли административную ответственность.

**Ведущий 2**. Новое положение, принятое в 1953 году, просуществовало довольно долго и было отменено в 1974 году в связи с введением нового «Положения о паспортной системе в СССР». С этой поры паспорт стал документом жизненно важным.

**Ведущий 1**. Эта важность сохраняется и по сей день.

**Ведущий 2**. И сейчас, ребята, когда вы сдадите экзамен на гражданскую зрелость, то также сможете получить данный документ.

Принимать устный экзамен предоставляется______________________

1. Сколько страниц в паспорте? (32)
2. С какого возраста паспорт действует бессрочно? (С 45 лет.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Что написано на первой странице паспорта?

(Паспорт гражданина Республики Беларусь.)

4. Какая информация о владельце паспорта находится на странице рядом с фото?

(Фамилия, имя, отчество, пол, дата рождения, место рождения.)

5. Какие сведения еще указаны в паспорте?

(Семейное положение, имена детей, регистрация места жительства.)

6. Защищены ли водяными знаками страницы паспорта? (Да.)

7. Что должен предпринять гражданин, потерявший паспорт?

(Немедленно заявить в органы внутренних дел.)

8. Делается ли отметка о вероисповедании в паспорте? (Нет.)

9. Указывается ли в паспорте национальность? (Нет.)

10. Встречаются ли в паспорте римские цифры? (Нет.)

11. Сколько цифр в номере паспорта? (7.)

12. В каких случаях вам могут выдать паспорт повторно?

(При его утрате или смене фамилии.)

13. В каких случаях паспорт необходим?

(При устройстве на работу, покупке билета на поезд, самолет, при записи в библиотеку, обращении в поликлинику и т.п.)

14. Что относится к знакам суверенитета государства?

(Флаг, герб, гимн.)

15. Что такое гимн?

(Слово «гимн» в переводе с греческого означает «торжественная песнь». Гимны могут быть: государственные, военные, религиозные.)

16. Назовите авторов Государственного гимна Республики Беларусь.

(Слова Михаила Климковича, Владимира Коризны, музыка Нестора Соколовского.)

17. Кто является главой нашего государства?

(Президент.)

18. Какие еще документы человек получает в течение жизни?

(Свидетельство о рождении, аттестат зрелости, паспорт, диплом, свидетельство о браке, военный билет, пенсионное удостоверение.)

19. Какой из названных документов вы получили самым первым?

(Свидетельство о рождении.)

**Ведущий 1**. Ребята, а сейчас, когда вы успешно выдержали испытание, вам выпала честь получить путевку во взрослую жизнь из рук заслуженных работников нашего района. Несомненно, это событие останется в вашей памяти на всю жизнь.

**Ведущий 2**. Для торжественного вручения паспортов приглашаются ...

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Ведущий 1**. Для торжественного получения паспорта гражданина Республики Беларусь приглашается ...

Ведущий называет фамилию, имя и отчество юноши или девушки, вручает паспорт, брошюру с текстом Конституции, книги «Я — гражданин Республики Беларусь», цветы.

**Ведущий 2**. Дорогие друзья, вам вручен самый важный документ, который станет вашей путевкой в жизнь, взрослую и самостоятельную! Ответное слово предоставляется учащимся.

**1-й учащийся**. Мы понимаем, что от нашего поколения зависит возрождение страны, ее будущее.

**2-й учащийся**. Принимая почетное звание гражданина Республики Беларусь, клянемся своей учебой, трудом и делами укреплять авторитет и доброе имя Мотольской школы.

**Все.** Клянемся!

**3-й учащийся**. Клянемся быть достойными памяти тех, кто отдал свои жизни за честь и независимость нашей Родины.

**Все.** Клянемся!

**4-й учащийся**. Клянемся свои знания, труд отдать на то, чтобы быть настоящими хозяевами родной земли и всеми силами способствовать возрождению Беларуси.

**Ведущий 1**. Вот уже более 20 лет действует первая в истории Белорусского государства Конституция. Защита законных прав граждан страны, их будни, праздники, труд, отдых и взаимоотношения — отражены в ее статьях. Соблюдать основной закон страны — патриотический долг каждого из нас.

**Ведущий 2**. И мы — современная молодежь, активисты БРСМ — любим свою Родину, заботимся о ее процветании, несем ответственность за ее судьбу.

**Ведущий 1**. И чтобы наши слова не расходились с делом, вашему вниманию предлагается фильм о деятельности Ивановского районного комитета БРСМ.

На экране кадры фильма.

Процедура вручения паспортов.

**Ведущий 2**. И вновь музыкальное поздравление. (*Песня*.)

Стихи.

## ПЕСНЯ

Молодость! Возьми с собой в дорогу
Самую заветную мечту;
За людей душевную тревогу,
Сердца жар и мыслей красоту,
Мудрость чувства,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Стойкость в бурях жизни,
Мужество во всем и до конца, верность другу,
преданность отчизне, имя гражданина и борца.

**Ведущий 1**. Дорогие ребята! С сегодняшнего дня для вас наступает новое время — время воплощения мечты, время созидания. Мы видим на ваших лицах свет юношеской романтики. Пусть и через года ваши глаза блестят радостью. Никогда не оставайтесь равнодушными.

**Ведущий 2**. Будьте активны в своей жизни и в жизни родной страны, смело идите к цели и ведите за собой других! Любите свою Родину! А мы со своей стороны всегда поддержим ваши добрые начинания. Помните, что с вами всегда готова дружить молодежная организация — БРСМ. Она поможет вам раскрыть свои способности. Знайте, что молодость — лучшее время жизни человека! Ловите каждое ее мгновение, верьте в себя и свои силы! Смело и уверенно шагайте в будущее, в будущее с Белорусским республиканским союзом молодежи!

*Гомельская вобласць*

Валасовіцкі сельскі Дом народнай творчасці

## ТЭАТРАЛІЗАВАНАЯ КАНЦЭРТНАЯ ПРАГРАМА «САЛДАТАМ ПЕРАМОГІ»

Дзеючыя асобы:
Вядучыя, Салдат, Дзяўчына

Гучыць лірычная беларуская музыка, выходзяць Вядучы, апрануты ў салдацкую форму, і Вядучая.

**Салдат**.

Не экскурсантам, а салдатам,
Абпаленым агнём баёў
З гранатамі ды аўтаматам
На дах Рэйстага я ўзышоў.

А пада мною снег узняты,
Прабіты кулямі, палаў.
Ад волжскіх стран да Сталінграда
Ён шлях салдатам асвятляў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Дзяўчына**. Была ўрачыстасці хвіліна
Пасля паходаў і турбот!
За ўсю вайну ўпершыню так
Спакойна выцер з твару пот.

Глядзеў на ўсход ты ў задуменні,
Здалёку бачыў родны край:
Палеткі ў зелені вясенняй,
Свой Гомель, па-над Сожам гай.

Спяшайся ж ты да каласоў у полі,
Да тых прыціхлых трох бяроз,
Да той пяшчотнай і лагоднай песні,
Што добра так матулечка пяе да слёз.

У выкананні салісткі гучыць жніўная песня «У бары кукавала зязюля».

Дзяўчына ў сялянскім адзенні з сярпом на плячы.

У бары кукавала зязюля,
Яе песню я слухаў не раз,
Гэта ты, дарагая матуля.
Залівалася плачам па нас…

Не сумуй, дарагая матуля,
Што сыноў тваіх дома няма…
Нас мінула варожая куля,
І не страшна нам злая зіма.

І не страшны нам вораг пракляты,
Б’ем яго мы удзень і ўначы.
Скора, скора падмажа ён пяты,
Ды не ўдасца, бадай, уцячы...

Калі ж заўтра варожая куля
Прынясе мне смяротны канец,
Не сумуй, дарагая матуля,
Што за край наш загіне баец.

Выхад мужчынскай вакальнай групы ў салдацкай форме.
Выкананне песні «Эх, дарогі ды сосны».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Вядучы 1**. Я вярнуўся дадому, да бацькоўскае хаты,
Пасля доўгіх расстанняў і ваенных дарог
Сустракай мяне, мама! Я вярнуўся да хаты,
Я вярнуўся салдатам на бацькоўскі парог.

**Вядучы 2**. А навокал музыка гучала.
Сустракала салдата кожная хата
Добрай песней і танцам заўзятым.

Выконваецца вянок народных танцаў на 2 калены («Падыспань», «Нарэчанька», «Карапет» і інш.). Выконваюцца прыпеўкі на ваенную тэму. На апошняй прыпеўцы з цэнтра да мікрафона падходзіць удзельнік, апрануты ў салдацкую форму, і чытае верш Паўлюка Пранузы «Родная мова».

У бліндажы, ў траншэі вузкай
Хоць бой упарты бушаваў,
А роднай мовы беларускай
Ніколі я не забываў.

На гэтай мове калыханку
Спявала маці ў цішыні.
«За Беларусь!» — на грозным танку
Пісаў прад боем на брані.

У час кароткага прывалу,
Хоць трошкі адпачыць бы рад,
Я кнігу з вершамі Купалы
Чытаў для землякоў-салдат.

Мы ўяўлялі, што калоссе
Стаіць у залатой красе;
У небе жураўы, і восень
Дары багатыя нясе;

Зязюля кукавала ў лесе
І вяшчала людзям лёс;
Парашутысткаю Алеся
Ляцела з сінявы нябёс;

Ішлі сыны да бацькі ў хату,
Вакол ляны цвілі ў палях...
І слова роднае салдату,
Як сонца, асвятляла шлях.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гучыць песня «Палессе» на словы А. Грачанікава і музыку У. Будніка.

**Салдат**. Шмат прайшоў краёў, бачыў многа,
Многа пройдзена салдацкіх дарог
А найлепшая тая дарога,
Што вядзе на бацькоўскі парог.

**Дзяўчына**. За лугамі дубрава, за ракою поле,
За полем шумлівы і велічны бор
О, край мой любімы, як многа прыволля
І думам, і працы бяскрайні прастор.

На апошніх словах на сцэну з двух бакоў выходзяць удзельнікі вакальнага калектыву і выконваюць песню «Зямля мая» на музыку Л. Захлеўнага.

**Вядучы 1**. Як люблю я пачуць мелодыі,
Каб натхнялі нас і лагодзілі
Задушэўныя і сардэчныя,
Сэрцу блізкія, чалавечныя.

Гучыць песня «День Победы» на словы І. Харытонава і музыку Д. Тухманава.

На сцэну пад мелодыю полькі выбягаюць удзельнікі дзіцячага фальклорнага калектыву «Некрашынка» і маладзёжнага ансамбля «Золак», выконваюць польку з прыпеўкамі.

**Вядучы** (*у беларускім адзенні*).
Глядзім — узносяцца будынкі
То з той, то з гэтай стараны,
І цешаць вочы мне навінкі
І сэрца радуюць яны...

Гучыць народная песня «Выйду я на вуліцу...», саліст і вакальны дзіцячы квартэт.

**Вядучы**. Шумяць па-новаму дубравы —
На край свой люба мне зірнуць.
Цябе, зямля, ў адзенні новым
Хацела б к сэрцу прыгарнуць.

На сцэну выходзяць усе ўдзельнікі і выконваюць песню на верш А. Бачылы, муз. У. Алоўнікава «Радзіма мая дарагая».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Мінская вобласць*

Людвіноўскі сельскі Дом культуры

# ЛИТЕРАТУРНО-МУЗЫКАЛЬНАЯ КОМПОЗИЦИЯ НА ЭКОЛОГИЧЕСКУЮ ТЕМУ «ПРОСТИ, ЗЕМЛЯ»

Действующие лица:

**Ведущие**

Экспозиция

В фойе Дома культуры были оформлена выставка детского творчества «Здесь мы с вами живем» — поделки из природного материала, мягкие игрушки, фотографии.

Завязка

На большом экране идет демонстрация документальных кадров о природе (леса, озера, реки, животные). На сцене на специальной подставке стоит большой глобус. Звучит фонограмма песни «Притяжение Земли». Затемненный свет, с экрана пропадает изображение, звучит космическая музыка (синтезатор). На сцене появляются люди в черных плащах. Они исполняют хореографическую композицию. Нарастание тревоги, музыка усиливается, пробивается колокольный звон. Люди-плащи исчезают. Зажигается более яркий свет, на экране — изображения документальных кадров (рубка леса, отстрел животных и т.д.), глобус накрыт черной тканью. На экране на фоне меняющихся кадров начинается программа.

**Ведущий 1**. Добрый вечер, уважаемые гости, уважаемые односельчане!

**Ведущий 2**. Сегодняшняя наша встреча посвящена экологии.

**Ведущий 1**. Что же такое экология?

**Ведущий 2**. Это совокупность научных и практических проблем, взаимодействия человека и природы.

**Ведущий 1**. Но мы эту проблему попробуем рассмотреть с помощью стихов и музыки.

Звучит песня «Колокол далей небесных».

Развитие действия

**Ведущий 1**.
Пока планета еще жива,
Пока о солнце мечтают весны,
На жизнь предъявим свои права,
Пока не поздно, пока не поздно.

**Ведущий 2**.
Земля, как сердце у нас в груди,
Здесь наше небо и наши гнезда.
Еще не поздно ее спасти,
Еще не поздно, еще не поздно.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Ведущий 1**. Неужто завтра замрут моря,
Умолкнут птицы, застынут сосны,
Уже не сможет взойти заря,
И спросит небо: «Неужто поздно?»

**Ведущий 2**. Так поклянемся, что мы спасем,
И что небо в надеждах звездных,
Спасем планету — наш добрый дом,
Пока не поздно, пока не поздно.

Звучит песня «Земляне».

Звучит песня «Живи родник».

СТИХОТВОРЕНИЕ «О ЧЕМ ПОЕТ КРИНИЧКА»

**Ведущий 2**. Где-то рядом с домом отчим
Есть у каждого река.
Та река и днем, и ночью
Манит нас издалека.
Ах, река, река родная,
Утонуло небо в ней,
Голубая-голубая...
Не бывает голубей.

**Ведущий 1**. Ученые подсчитали, что каждый год во всем мире в водоемы попадает столько вредных веществ, что ими можно было бы заполнить 10 тысяч товарных поездов. Даже в чистых водах Арктики нашли стиральный порошок, а у берегов Гренландии — радионуклиды Чернобыльской аварии. В результате деятельности человека в реках Сена, Волга, Дунай, Рейн купаться вообще нельзя.

**Ведущий 2**. Перенасыщены ядовитыми продуктами водоемы. Река Свислочь загрязняется. Ухудшается состояние озера Нарочь.

Звучит песня «Птица».

**Ведущий 1**. Человек не стал существом разумным. Сам себе присвоил звание это и гордится им. Только доказано ли оно? И кем? Жалко, что не доступен нам язык природы. Очень много мы могли бы узнать о себе. Мы не слышим и слышать не хотим, хозяева земли. Покорители! Преобразователи!

**Ведущий 2**. Ученые утверждают, что голос человека слышат даже цветы. А деревья чувствуют, когда к ним приближается человек с топором. Жаль, что не могут ответить на наше обидное слово и от удара отклониться. Но сдачу мы получим рано или поздно по полному счету.

Звучит песня «Беловежская пуща».

Звучит песня «Птица».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Ведущий 1**. Лебеди на Сервочи, возле нашей деревни появились недавно, но охотник выследил их сразу. Упустить редкую возможность, конечно, не мог. Схватил ружье — и бросился к месту, что облюбовали птицы. Вот так. Захотел выстрелить — и выстрелил.

Звучит песня «Лебединая верность».

**Ведущий 2**. Из глубины ямы, доносится звучный плач котенка. Выбралось из капкана серенькое существо, шаталось долго до солнечного пригорка. Обессилено упало на сухую, теплую траву... разве так можно?! Но котенок грязный — от него можно заразиться и заболеть... Научились мы беречься от заразы.

Звучит песня «Шэры коцік».

СТИХОТВОРЕНИЕ «БЕЛКА»

**Ведущий 2**.

Убита белка на снегу,
Она распластана лежала,
Как-будто все еще бежала
Да вдруг застыла на снегу.
А мальчик, полотна белей
Коленями уткнулся в снег.
Глядит, не поднимая век,
Не смея прикоснуться к ней.
И лес, как омут тишины,
И бусы глаз ее черны,
Бери же мальчик, все твое!
Но кинул он на снег ружье,
И тает синеватый дым
Над снегом твердым и седым.
И пес на радостях отчаян,
Чего ж охотник так печален?
Его никто не обвинит,
Что выстрел меток был и лих.
Но он сидит суров и тих,
Лишь рядом белый куст дрожит...

**Ведущий 1**.

Примятая травинка,
Пригнутая осинка,
Какие пустяки.
Убитая букашка,
Да сбитая ромашка,
Какие пустяки.
Растоптана поганка,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Раскопана полянка,
Какие пустяки!
Засорены, забиты,
Забиты роднички.
Какие пустячки!
И вот уже от речки,
И вот уже от леса
Остались пустяки —
Засохшая осинка,
Заросшая тропика,
Убитая букашка
Да сбитая ромашка.

Звучит песня «Цветы луговые».

Звучит песня «Белые розы».

**Ведущий 2**. Я люблю природу, потому что она прекрасна. А еще в ней есть необходимое для жизни.

**Ведущий 1**. Например, деревья дают кислород, который необходим всему живому. Волки — санитары леса. Паук уничтожает вредных насекомых. Дятел лечит деревья. А ласточки помогают нам наблюдать за природой.

СТИХОТВОРЕНИЕ «ЧТО ЗНАЧИШЬ ТЫ...»

Что значишь ты без трав и птиц.
И без любви к пчеле жужжащей,
Без журавлей над хвойной чащей
Без миловидных лисьих лиц?
Когда поймешь ты, наконец,
О, человек, венец природы,
Что без природы твой конец?!

**Ведущий 1**.
Дерево, трава, цветок и птица
Не всегда сумеют защититься.
Если будут уничтожены они,
На плане мы останемся одни.

Звучит песня «Прекрасное далеко».

Стихотворение «День добрый, лес!».

**Ведущий 2**. Маленький человек должен быть добрым ко всему живому. Только доброта открывает ребенку радость бытия, радость человеческих взаимоотношений, — убеждал В. А. Сухомлинский. И, наверное, был прав.

Звучит песня «Всем нужны друзья».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Звучит песня «Здравствуйте, птицы».

Звучит песня «Помогите кенгуру».

СТИХОТВОРЕНИЕ «МОТЫЛЕК»

Я живу на руках, и в садах, и в лесах,
Я летаю весь день в голубых небесах.
Солнца ласковый свет озаряет мой кров.
Мне еда и питье — ароматы цветов.
Но живу я недолго — не более дня.
Будь же добрым со мной — и не трогай меня.

Звучит песня «Бабочки на снегу».

СТИХОТВОРЕНИЕ «ЕСТЬ НА ЗЕМЛЕ ОГРОМНЫЙ ДОМ»

Есть на Земле огромный дом
Под крышей голубой.
Живут в нем солнце, дождь и гром,
Лес и морской прибой,
Живут в нем птицы и цветы,
Веселый звон ручья,
Живешь в том доме светлом ты
И все твои друзья.
Куда б дороги не вели,
Всегда ты будешь в нем.
Природою родной земли
Зовется этот дом.

**Ведущий 1**. Бесспорно, Земля неразрывно связана с Космосом, и понять «земное» можно лишь обращаясь к «небесному».

**Ведущий 2**. Первым увидеть то, чего еще нет в кладовой человеческих знаний — это здорово!

Звучит песня «Земля в иллюминаторе».

Звучит песня «Мне приснился шум дождя».

**Ведущий 1**. Есть одна планета — сад.
В этом космосе холодном,
Только здесь леса шумят,
Птиц скликая перелетных.

**Ведущий 2**. Лишь на ней одной увидишь
Ландыши в траве зеленой,
И стрекозы только тут
В реку смотрят удивленно.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Ведущий 1**. Берегите свою планету,
Ведь другой на свете нету.

Звучит фонограмма «Желаю тебе, Земля моя».

Кульминация

На экране идет демонстрация кадров, где дети сажают деревья, ухаживают за животными и т.д.

На фоне музыки голос.

Смотрю на глобус — шар земной,
И вдруг вздохнул он, как живой.
И шепчут мне материки:
«Ты береги нас, береги!»
В тревоге рощи и леса,
Роса на травах, как слеза,
И тихо просят родники:
«Ты береги нас, береги!»
Грустит глубокая река,
Свои теряя берега,
И слышу голос я реки:
«Ты береги нас, береги!»
Остановил олень свой бег:
«Будь человеком,
В тебя мы верим, не солги!
Ты береги нас, береги!»
Смотрю на глобус — шар земной,
Такой прекрасный и родной
И шепчут губы: «Сберегу,
Я сберегу вас, сберегу!»

На сцену выбегают дети в ярких костюмах. Они исполняют хореографическую композицию. Одни изображают реку (в голубом), другие — лес (в зеленом), третьи — цветы (в желтом). Когда деты расступаются — на сцене — глобус, но уже не покрытый черной тканью, а на нем стиот огромный венок цветов.

Финал

Звучит финальная песня «Прости, Земля».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Баркалабаўскі сельскі культурна-спартыўны цэнтр

## ТЭАТРАЛІЗАВАНАЯ ДЗЕЯ «СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ БАРКУЛАБАВА» (ПАВОДЛЕ БАРКАЛАБАЎСКАГА ЛЕТАПІСУ)

Дзеючыя асобы:
Летапісец, Пан Баркулаб,
Ігумення, Князь Пажарскі,
Князёўна Алена Саламярэцкая,
Князь Багдан Статкевіч

Гучыць музыка, да стала падыходзіць Летапісец, садзіцца, пачынае пісаць гусіным пяром на аркушы паперы.

**Летапісец**. З 1628 года паводле шлюбнага дагавора дачкі Хадкевіча з літоўскім маршалкам Янам Сапегам, горад перайшоў ва ўладанне Сапегаў. Горад мацнеў і рос, развіваўся гандаль, рамёствы. Культура беларускага народа набывала нацыянальную самабытнасць. У арыгінальнай літаратуры пачатку XVII стагоддзя важнае месца заняў гістарычна-мемуарны твор «Баркулабаўская хроніка».

Гучыць музыка, Летапісец працягвае пісаць. Удзельнікі сцэны займаюць месцы па перыметру пляцоўкі. Выхад кожнага персанажа суправаджаецца музыкай.

**Летапісец**. Па ўзяццю Полацкім за гаспадара караля Аўгуста, за мітрапаліта Дзевачку, за ўладара Полацкага Варсанофія Валоха, за ласкаю гаспадара караля, за вялікія заслугі перад народам сваім, за службу верную ў справе рыцарскай яго міласці пану Баркулабу Іванавічу Корсака, ротмістра і старасты Дзісенскага, на лесе глухім, на зямлі лясной, на ўрочышчы, празываемым Брус, за воляй Божай і за благаслаўленнем людзей духоўных, залажыў замак імем сваім Баркулабаў 1564 року...

Музыка змяняецца, выхад пана Баркулаба.

**Пан Баркулаб** (*выходзіць нібы на прыгорак, углядаецца*).

Слаўнае месца! Вось на гэтай гары стаяць майму замку Баркулабаву. Шмат каму ён калыскаю стане: тут і хлебна, і рыбна, і пчольна. А яшчэ трэба будзе царкву залажыць, каб люд мясцовы Бога славіў і ўвесь мой род. Не здраджу веры праваслаўнай, і народ мой не здрадзіць. Не адракуся ад мовы роднай, ад духоўнай спадчыны. Быць царкве праваслаўнай імем Георгія Пераможца!



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вяртаецца на сваё месца.

**Летапісец**. Князёўна Алена Саламярэцкая ўступіла ў шлюб з Багданам Статкевічам. Маладыя вырашылі пабудаваць жаночы манастыр.

Выхад князёўны Алены і Багдана Статкевіча.

**Алена**. Князю мой светлы, дазволь слова сказаць, і не гневайся, калі не спадоблю табе.

**Князь**. Гавары, князёўна, не прагневаюся.

**Алена**. Імем Госпада Бога нашага, хачу, каб быў закладзены яшчэ і жаночы манастыр. А ты, светлы князю, перадаў у дараванне востраў Барок, Хадуціцкія сенажаці, вадзяны млын да быхаўскай зямлі на вечныя часы жаночаму манастыру.

**Князь**. Разумею цябе, князёўна. Усё будзе так, як ты жадаеш. У самым маляўнічым кутку, на беразе Дняпра, будзе стаяць манастыр імем Узнясення Гасподня, а манахіні ў малітвах будуць прасіць за ўвесь наш род, за нашчадкаў і павінных яму.

**Алена**. Так таму і быць!

Удзельнікі адыходзяць на задні план.

**Летапісец**. І хоць князёўна Алена ў хуткім часе памерла, князь здзейсніў дадзены зарок. На поўдзень ад Баркулабава, у маляўнічым кутку паблізу Дняпра быў пабудаваны храм імя Узнясення Гасподня. Пазней пабудавана званіца-брама, мураваная агароджа і іншыя пабудовы.

Неўзабаве пасля будаўніцтва храма ў жыцці манастыра адбылася незвычайная падзея. Манастырская кніга так фіксуе гісторыю праслаўлення Баркулабаўскай іконы: «Таямніцу царскую патрэбна захоўваць, а справы Божыя адкрываць. Дапушчэннем Божым, пасля вайны ў Польшчы і Літве, ад нараджэння Хрыстова 1659 года, ідучы назад з Польшчы князь820 вояў рускіх, празваны Пажарскім, употай узяў з сабой гэтую цудоўную святыню Багародзіцы...».

**Князь Пажарскі**. Час рухацца далей. Воіны слаўныя, падымайце ікону Багародзіцы імем Госпада Бога. Але што гэта? Не зварухнуць з месца! Прасвятая Багародзіца знайшла сваё месца ў гэтым манастыры?! (Звяртаецца да ігумені.) Матухна ігуменні, Фацінія Кірнараўна, вазьміце ікону Прасвятой Багародзіцы, відаць, жадае Маці Божая тут знаходзіцца.

Ігуменні з паклонам прымае ікону, цалуе і перадае манахіням.

**Ігуменні**. Як ад нараджэння звяры, што ходзяць у пустыні і ведаюць ямы свае, птушкі, што лётаюць па паветры, ведаюць гнёзды свае, рыбы, што плаваюць па моры і рэках, чуюць віры свае, пчолы бароняць вуллі свае, так і людзі,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзе нарадзіліся і ўскормленыя, да таго месца вялікую ласку маюць. Няхай жа з пашанай застаецца ў нашым слаўным манастыры цудадзейная святыня Багародзіцы.

**Летапісец**. З належным гонарам ікону паставілі сярод царквы. А калі прыйшлі раніцай, ікона стаяла каля сцяны з правага боку, выбраўшы сабе месца. Святкаванне яе адзначаюць 24 ліпеня, у дзень Яўхіміі Прахвальнай, калі гэта ікона прыбыла ў манастыр Баркулабаўскі. Вестка аб дзівосным з'яўленні хутка распаўсюдзілася, і з розных канцоў пачалі сцякацца багамольцы, каб пакланіцца цудадзейнаму вобразу. Кожны, хто чыстасардэчнай верай маліўся, атрымліваў суцяшэнне і вылячэнне...

Удзельнікі кампазіцыі пакідаюць пляцоўку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Гродзенская вобласць*

Пагародзенскі сельскі цэнтр культуры і вольнага часу

## СВЯТОЧНА-КАНЦЭРТНАЯ ПРАГРАМА «ЭХ, КАЛЯДАЧКІ!»

Уклад.-маст. кіраўнік *С.В. Салмановіч*

Дзеючыя асобы:

Зазывалы, Вядучыя, Цыганы, Дзед, Механоша, Гаспадар, Гаспадыня, Удзельнікі

Група Калядоўшчыкаў на санях, запражоных коньмі, пачынае аб'езд усіх вуліц вёскі, запрашае жыхароў на свята.

**Зазывала 1**.
Зіхаціць на небе сонца,
Рана разгараецца,
А у нас сягодня з вамі
Свята пачынаецца!

**Зазывала 2**.
Добры дзень, паважаная грамада!
Старыя і маладыя,
Рухавыя і жвавыя,
Гаспадары ўдалыя!

**Зазывала 1.** Ад усіх дзвярэй,
Ад усіх варот,
Ты выходзь хутчэй,
Весялей, народ!

**Зазывала 2.** Сёння Падкалядны сход,
Збірайся каля нас, народ,
Будзем танчыць, гуляць і спяваць,
З Раством добрым люд віншаваць!

**Зазывала 1.** Станавіцеся, людцы, у карагод,
Гэта свята мы чакалі цэлы год.
З Раством усіх рады павітаць,
У гонар свята песню заспяваць!

Гучыць песня «Неба і зямля».

На пляцоўцы з'яўляюцца вядучыя.

**Вядучы 1**. Добры дзень паважаныя сябры!

**Вядучы 2**. Дзень добры, аднавяскоўцы і ўсе тыя, хто ў гэты святочны час наведвае наш гасцінную вёску.

**Вядучы 1**. Нам вельмі прыемна, што мы сёння ўсе разам сабраліся ў гэтай зале, каб сустрэць адно з самых чароўных свят — Каляды.

**Вядучы 2**. Бо свята гэта адно з самых любімых свят нашага народа напрацягу ўжо не аднаго стагоддзя.

**Вядучы 1**. Каляды — свята сонца, бо менавіта ў гэты час сонца паварочвае на лета, а прырода напаўняецца новая маладой сілай.

**Вядучы 2**. Давайце сустрэнем гэтае свята прыгожа ды спеўна, як дзяды і бабулі нашы сустракалі!

**Вядучы 1**. Давайце будзем вясёлымі, дружнымі, добрымі, бо сёння ўсе мы каляднікі — вясёлыя ды гаманкія, на дабро не скупыя!

Гучыць песня «Учора з вячора».

На пляцоўцы з'ўляецца гурт калядоўшчыкаў, які паступова накіроўваецца да сцэны.

**Дзед**. Добры дзень таму, хто ў гэтым даму!

**Удзельнік 1**. Ой, і вялікае свята сёння, паночку,
ды на нашым дварочку.

**Удзельнік 2**. На вулачцы холадна стала. Каляда ў Пагароднa завітала.

**Удзельнік 3**. А людзей тут цераз край, хоць лыжкаю мяшай.

**Механоша**. А ці рады вы нам?
Калі вы нам рады,
Мы вам да парады.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Цыганка 1**. І як кажуць нашы людзі,
Хай вам да спадобы будуць жарты, песні,
Бо без песні жыць няёмка, хоць ты трэсні.
А без скрыпкі і дуды ходзяць ногі не туды.

**Цыганка 2**. А яшчэ ў прывітанні пажадаць мы вам хацелі,
Каб ад нашага спаткання крышку вы памаладзелі.

**Цыганка 3**. Каб не ведалі вы злосці,
Каб жылі ў весялосці.

**Дзед**. Вушы каб у вас не вялі,
Каб вы добра тут гулялі.

**Механоша**. Усім ад краю і да краю…

**Усе**. Шчасця і дабра жадаем!

**Удзельнік 1**. Станавіцеся, людцы, у карагод,
Гэта свята мы чакалі цэлы год.
Трэба шчыра Каляду павітаці,
У яе гонар песню праспяваці!

Спяваюць песню «На новае лета».

**Удзельнік 2**. Каляда ніводны двор не мінае.
Са святам усіх вітае.

**Удзельнік 3**. Вось глядзіце! Чыясьці хата і святло запалена,
мабыць, нас чакаюць!

**Дзед**. Добры вечар таму, хто ў гэтым даму.

**Усе разам**. Святы Вечар!

**Цыганка 1**. Гаспадар! Ці спіш, ці ляжыш, ці на бога глядзіш?

**Цыганка 2**. А калі не спіш, уставай з пасцелі,
адчыняй дзверы, замятай двары.

**Цыганка 3**. Стаў сталы, сцялі абрус, сустракай госцікаў.

**Удзельнік 1**. А ў нас сёння сход Каляд,
Сабірайцеся ўсе ў рад.
Адну зіму песні пяяць,
Будзем іх у рэшаты складаць.

**Удзельнік 2**. У рэшаты складаць, ды вас, паночкі ды паненкі, частаваць.
Куццю варыці, ды на ёй варажыці.

**Удзельнік 3**. Танчыць, у гульні гуляць,
Ды з калядамі…

**Усе**. ВІНШАВАЦЬ!

Песня «Добры вечар таму, хто ў гэтым даму».

**Дзе**. Гэй, гаспадары, не ганіце гасцей!



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Механоша**. Бо ведаем, што сядзіце на сонцы
Ды лічыце чырвонцы.
**Дзед**. Просім выйсці на ганачак,
просім вынесці нам падаруначак.
**Гаспадар**. Добры дзень, шаноўныя сябры,
але з чым вы да нас прыйшлі?
Чым нас парадуеце?
**Дзед**. Мы калядоўшчыкі, ідзём да пана нашага Лета,
Ідучы пытаем, што сказаці маем, свайму пану Году,
Што носіць бароду.
Сіву і касмату, вяліку, як лапату.
**Механоша**. Ідзём кругом света, аж ад пана Лета.
Мы к Лету ідзём, казу вядзём,
Людзям радасць нясём.
**Удзельнік 1**. Мы прыйшлі да вас пакалядаваць,
Шчасця, дабрабыту пажадаць!
**Удзельнік 2**. Тут з намі каза. Каза наша вучоная, кіем хрышчоная,
прайшла розныя навукі, робіць розныя штукі.
**Гаспадар**. Дзе вы такую казу дасталі?
**Дзед**. На Воранаўскім кірмашу купіў — 700 грошаў плаціў!
**Гаспадар**. Можа прадасі?
**Дзед**. Мільён плаціце і бярыце!
**Гаспадар**. А ці можна яе паштурхаць, пабурхаць пад бачок.
**Дзед**. Штурхай, хай цябе бура бурхае!

Каза б’е гаспадара.

**Гаспадар**. Дзяржы сваю казу, яна мне два рэбры выбіла!
**Дзед**. Ой, бачу, ты як заяц баязлівы, як кот шкадлівы,
ану, казіца, задзяры рогі, падымі ногі,
ану разыдзіся, ану пакажыся.
**Механоша**. Няхай яна для паважаных гаспадароў патанцуе,
Шчасцейка ды ўраджаю падаруе!
**Цыганка 1**. Дзе каза ходзіць, там жыта родзіць.
**Цыганка 2**. Дзе каза хвастом, там жыта кустом.
**Цыганка 3**. Дзе каза нагою, там жыта капною.
**Удзельнік 1**. Дзе каза рогам, там жыта стогам.
**Удзельнік 2**. Дзе каза пагуляла, таму шчасця, долі пажадала.
**Дзед.** Ну-ка, козанька расхадзіся, усім людзям пакланіся:
гаспадару, гаспадыньцы, іх дачцэ Марыйцы!

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Калядоўшчыкі выконваюць вакальна-харэаграфічную кампазіцыю пад песню «Го, го, го, каза!», у час якой каза танцуе, а затым знямоглая валіцца долу.

**Удзельнік 1**. Ой, каза ўпала. Што з ёю здарылася?

**Удзельнік 2**. Стамілася, напэўна. Здалёк ідзе, ледзь ногі валачэ.

**Удзельнік 3**. Каб каза магла ўстаць, трэба казу пачаставаць.

**Механоша**. А ў Пагароднa ёсць чым пачаставацца.
Толькі з мясным цэхам
у Падваранцах трэба звязацца!
Тут каўбасы, паляндвіца, сала,
каб наша козачка ўстала.

**Удзельнік 1**. Ёсць тут здобы, булкі, пірагі,
Каб каза ўстала на чатыры нагі.

**Удзельнік 2**. А я носам чую піражок,
Каб у казы не часаўся ражок.

Гаспадары выносяць пачастункі для казы.

**Гаспадыня**. Вось казе вашай пачастункі, прысмакі і ласункі.

**Гаспадар**. Вось вам кавалак сала, каб ваша козанька ўстала.

**Дзед**. Дзякую вам, гаспадары за падарункі,
Казе даспадобы вашыя ласункі!

Каза падымаецца. За сцэнай «Но, но, каб цябе халера».

**Цыган**. Добры дзень усім! Са святам вас!

**Гаспадыня**. І табе добры! А каго гэта ты за сабою прывёў?

**Цыган**. Гэта мой конь вучоны. Гляньце! У вачах агонь!
Разумее ўсё з паўслова, дзе ж вы бачылі такога?
Можа купіш, гаспадар? У мяне такі тавар!
Аддаю задарам, усяго за тысячу даляраў!

**Гаспадар**. Э не! Ды за такога каня аддаць грошы шкада. Ён на зямлі ледзь стаіць!

**Цыган**. Дык у яго баляць ногі з доўгай дарогі! Вы лепш паглядзіце, павы, які ён у мяне ласкавы! Паглядзіце, якая ў яго паходка, плыве, як у моры лодка. А як мой сівы бяжыць, дык пад ім зямля дрыжыць!

Конь паказвае свае ўменні.

**Гаспадыня**. О, чуць не ўпаў!

**Цыган**. А вы не глядзіце, што худаваты, ён так арэ, як валы! А вось, каб далі яму зараз пад'есці, пракаціў бы чалавек двесце! Слабы да худаваты, але шчасце прынёс у хату! За гэткую чэсць давай мне даляраў тысяч шэсць!

**Цыганка 1**. Купляй, гаспадар, каня, шчасце ён табе прынёс!

**Гаспадар**. Купляю!

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Цыган**. Дзякуй табе, гаспадар, што купіў у мяне тавар! (*Да каня*.) А ты, конік, не сумуй і мне ўсё даруй! Не журыся і не плач, лепей полечку затанч! Каб гаспадары і госці паразмялі свое косці!

Полька.

**Удзельнік 1**. Гаспадары, а чым вы нас частаваць будзеце?

**Удзельнік 2**. Вы нас частаваць будзеце, а мы вас віншаваць будзем:
З дзеткамі, з сонейкам,
А яшчэ з добрым здароўечкам.
Каб на лета дачакалі,
Калядоўшчыкаў зноў сустракалі!

**Удзельнік 3**. Гаспадары нашы ясныя.
Падаруйце гасцей калядоўшчыкаў.
Тры аклеці — рэшатам, тры печкі — пірагамі.

**Цыганка 1**. Чую ў гэтай хаце ёсць мядок, каўбаса і духмяны сырок, носам чую піражок.

**Цыганка 2**. Вынесь, вынесь падарачак.
Тысячу грошаў — нам на боты,
Дзве саракоўкі — нам на падкоўкі,
Дзеўкам на шалі ды на пярсцёнкі.

**Цыганка 3**. Сыр на талерцы.
Дзве чаркі гарэлкі.
Ды вазьмі драбіну,
Лезь па саланіну,
Каўбасу крутую,
А наверх другую.

**Механоша**. Падай каўбасу,
Я ў зубах панясу.
Хоць адзін маю,
Але ж утрымаю.

**Удзельнік 1**. Хутка дарыце, нас не мініце. Кароткія світкі, памёрзлі лыткі. Кароткія рукавіцы, памёрзлі пальцы.

**Удзельнік 2**. Ох, ты, дзядзечка, дай не гневайся. Запалі свечку, дай пайдзі ў клеці. Набяры грэчкі, наверх яечкі, набяры аўса, наверх каўбаса.

**Удзельнік 3**. Ай, ду-ду, ду-ду, я на хаце хаджу, печка топіцца, бліноў хочацца.

**Дзед**. Дайце каўбасу, дамоў панясу.
Дайце кравянку, укіну ў ямку.

Гаспадары прыносяць пачастункі для калядоўшчыкаў.

**Гаспадар**. Вось вам нашы пачастункі. Частуйцеся, госцікі дарагія, чым Бог паслаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Дзед**. Дзякуем, гаспадары, за пачастункі.
Вось за гэты піражок, зарадзіла б жыта стажок.
Каб у вашай хаце заўсёды было што даці.

**Удзельнік 1**. У нашага дзядзькі двор гараджоны,
Дай яму, Божа, шчасця, здароўя ў яго доме.
Двор гараджоны, явар саджоны,
А ў тым явары, да тры карасці,
Да тры карасці, да тры радасці.
Адна радасць — яснае сонца,
Другая радасць — дробны дождзык,
Трэцяя радасць — ясен месячык.

**Удзельнік 2**. Паважаныя гаспадары!
Жывіце год да ста так,
Хай будзе ў вашым двары
Прыбытак і дастатак.

**Удзельнік 3**. Каб вам мірна жылося,
Добра вялося,
Пілося і елася,
І яшчэ хацелася.

**Дзед**. А вы здаровы бывайце,
Праз гады нас чакайце.
Дзякуем гэтаму дому,
А мы пойдзем к другому.

Пад песню «Будзь ваша здароў» калядоўшчыкі выконваюць харэаграфічную кампазіцыю, затым пакідаюць сцэну, спяваючы «Учора з вячора».

**Вядучы 1**. Сягодня на нашым свяце адбываецца конкурс на лепшую снегавую скульптуру, злепленую вучнямі нашай школы.

**Вядучы 2**. Нагадаем, што менавіта сёння свята, наша паважанае журы, і вы — гледачы, павінны вырашыць, які ж з прадстаўленых шэдэўраў атрымае званне лепшага.

**Вядучы 1**. А выбіраць давядзецца з наступных канкурсантаў:
5 клас — скульптура…
6 клас — скульптура…
7 клас — скульптура…
8 клас — скульптура…
9 клас — скульптура…

**Вядучы 2**. А пакуль наша журы выбірае пераможцу, вас на гэтай сцэне віншуе народны ансамбль. Сустракайце!

Канцэртная праграма ансамбля.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Вядучы 1**. І вось надышоў час падвесці вынікі конкурсу на лепшую снегавую фігуру.

**Вядучы 2**. На сцэну запрашаюцца члены журы.

**Вядучы 1**.
А Каляда едзе далей,
Ніводны двор не мінае,
Са святам усіх вітае!

**Вядучы 2**.
А са святам усіх віншуе…

Эстрадная канцэртная праграма.

**Вядучы 1**.
Запалілі мы агні свята,
Каб асвятлілася ваша хата,
Хай пылаюць іскрынкі ў ночы,
Хай засвецяцца радасцю вочы.
Мы калядны фэст зачыняем,
Вам здароўя і шчасця жадаем!

**Вядучы 2**.
На Каляды калядуйцеся,
Піць і есці не шкадуйце!
Хай адрозніць Каляда, дзе медавуха, дзе вада!
Шчадруйце, шаноўныя.
Жывіце год да ста так!
Хай едзе ў вашы двары
Прыбытак і дастатак!
І долечка ваша хай будзе не горкай,
Хай свеціцца шчасцем
Калядная зорка!

**Вядучы 1**.
Каб не ведалі вы злосці,
Каб жылі ў весялосці,
Вушы каб у вас не вялі,
Каб вы добра ўсе гулялі.
Усім, ад краю і да краю,
Шчасця і дабра жадаем!

**Вядучы 2**.
Хай шчасце вашу хату не мінае!
Каханне хай яе не пакідае!

**Вядучы 1**.
Дай вам жыць у раскошы
І мець торбу грошай!

**Вядучы 2**.
Жыццё любіце, кахайце!
І на гэтым бывайце!

**Разам**.
Усяго вам добрага! Да новых сустрэч!

Гучыць вясёлая калядная музыка.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Баранавіцкі раённы цэнтр рамёстваў

## ГУЛЬНЁВА-ЗАБАЎЛЯЛЬНАЯ ПРАГРАМА «РУСІНОЎСКАЯ МАСЛЕНКА»

Дзеючыя асобы:

Вядучыя — Зазывалы-Скамарохі, Хлопец, Дзяўчына

Заднік сцэны ўпрыгожаны эмблемай з усміхаючымся блінам. Да танцпляцоўкі на возе, запражоным канём, пад'язджаюць хлопцы і дзяўчаты, скамарохі-зазывалы. Зазывалы запрашаюць людзей на свята.

**Зазывала 1**. А мы масленку дажыдалі,
Гару сыру набівалі,
Зверху маслам палівалі.
**Зазывала 2**. Хто з гары пракоціцца,
Той яшча вароціцца.
**Зазывала 1.** Масленка ж катліва
Пакатацца міла.
**Зазывала 2.** Не зважайце на мундзіры,
Выступайце ў турніры!
Зараз будзем строіць смешкі —
Запрашаем на пацешкі!

Хлопец з дзяўчынай сыходзяць з воза, бяруць чучала масленіцы і ставяць перад сцэнай. Падымаюцца на сцэну і пачынаюць праграму.

**Хлопец і Дзяўчына**.
Ой добры дзень вам,
Дарагім сябрам.
Сёння ў свята Масленкі
Будзем песні пеці,
Будзем гульні граці,
Зіму праважаці,
Зіму праважаці,
Вясну сустракаці.
**Хлопец**. Будзем сёння забаўляцца,
І блінцамі сілкавацца.
За вялікі блін, як сонца,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Трэба працаваць бясконца,
А каб каштаваць аладкі,
Адгадаем мы загадкі.

**Дзяўчына**. Я загадваю для дзяўчынак,
Беларускіх малайчынак.

**Хлопец**. А я буду для хлапцоў,
Беларускіх малайцоў.

**Хлопец**. На полі Ярох рассыпаў гарох — стала світаці, няма чаго збіраці. (Неба і зоры.)

Хто адказвае, атрымоўвае блін-жэтон.

**Хлопец**. Трымай аладку,
Каб была, як аладка, гладка.

**Дзяўчына**. А вы хлопцы, не сядзіце,
А таксама адкажыце!

Ляцеў птах, на воду — бах. Вады не скалыхнуў, на дно патануў. (Снег.)

**Дзяўчына**. Трымай блінец,
Каб быў маладзец!

**Хлопец**. Ну, дзяўчаты, не чакайце,
А загадку зноў гадайце!

Спераду шыльцы, ззаду вільцы, наверсе чорнае сукно, под сподам белае палатно. (Ластаўка.)

**Хлопец**. За такую цяжкую загадку атрымай, прыгажуня, аладку.

**Дзяўчына**. Чорная карова ўвесь свет пабарола, белая ўстала — увесь свет падняла. (Ноч і дзень.)

**Дзяўчына**. Атрымайце пачастунак —
Масленічны падарунак.

**Хлопец**. Мы загадкі адгадалі? (*адказваюць*)
Пераможцаў адзначалі? (*адказваюць*)

**Хлопец**. У каго цяпер блінцы,
Дзяўчыначкі і хлапцы,
Падыходзьце к нам хутчэй
Будзем мы гуляць далей!

Гледачы выходзяць на пляцоўку.

**Дзяўчына**. Вось яны, нашы знатакі. Паглядзіце, якія яны ўсе прыгожыя.

**Хлопец**. А ці так яны танцуюць, як красавацца ўмеюць. Музыканцік, рэзні нам полечку! Ды такую, каб ад танцаў дыміліся падэшвы!

Гучыць полька. Удзельнікі танцуюць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Дзяўчына**. Слухай, аднак жа добра ў іх атрымоўваецца. Адкуль толькі такія танцоры бяруцца?

**Хлопец**. Зараз мы праверым, як яны спяваць умеюць. Трымайце прыпеўкі.

Удзельнікі спяваюць.

Не хадзіце, дзеўкі, ў лазню,
Не хадзіце парыцца.
Ад гарачае прыпаркі
Макіяж адваліцца.

**Хлопец**. Паглядзіце, дзяўчаты, як нашы хлопцы спяваць умеюць, як яны стараліся!... А зараз мы пагуляем з вамі ў гульню «Вяроўка» і паглядзім, які хлопец будзе цягнуцца да сваёй дзяўчыны.

## ГУЛЬНЯ «ВЯРОЎКА»

Хлопцы, зрабіце, калі ласка, невялікае кола ў цэнтры пляцоўкі і трымайцеся за вяроўку, а дзяўчатырануць вакол хлопцаў у вялікае кола. Будзем вадзіць карагод. Па маёй камандзе кожны хлопец павінен дацягнуцца да сваёй дзяўчыны і пацалаваць яе, не адпускаючы вяроўку.

Праводзіцца гульня.

**Дзяўчына**. Вось якія ў нас хлапцы-малайцы. Здаецца, нейкая сіла незвычайная цягне іх да сваіх дзяўчат.

## ГУЛЬНЯ «ЦЕРАЗ ЛЕС»

**Хлопец**. Ну што, даражэнькія, будзем гуляць далей. Падзяліцеся, калі ласка, на дзве каманды. У кожнай павінна быць па 2 хлопца і па 2 дзяўчыны.

Вы ж ведаеце, якія ў нас завеі бываюць. А вось калі замяце ўсё навокал, ды так, што свету белага не ўбачыш, як вы праз лес прабірацца будзеце, каб дайсці дадому, надзець шапкі, каб не змерзнуць і вярнуцца да нас на свята ? А гэта мы зараз убачым. Каб не згубіць адзін аднаго, вам трэба, абягаючы пянькі-дрэўцы, дабегчы да сваёй «хаты» (паказвае на куб, дзе ляжаць шапкі), надзець шапкі і вярнуцца на месца. Хто гэта хутчэй зробіць, той і пераможца. Умовы зразумелыя? Падрыхтаваліся? Пачалі!

Праводзіцца гульня. Пераможцы атрымліваюць бліны.

**Дзяўчына**. Якія вы добрыя першапраходцы. Але ўсё ж перамагла вось гэтая каманда.

**Хлопец**. Зараз мы праверым, якія вы меткія. Трымайце снежкі і па камандзе пачынайце кідаць іх у кубы. Якая каманда больш пападзе, тая і пераможа.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праводзіцца гульня. Пераможцы атрымліваюць бліны.

**Дзяўчына**. У гульні пагулялі, а зараз трэба падлічыць колькасць атрыманых бліноў і вызначыць каманду, якая перамагла ў нашых масленічных спаборніцтвах. Перамагла вось гэтая каманда! Зараз усе ўдзельнікі змогуць абмяняць свае бліцы-падманкі на сапраўдныя.

Калі ласка.

Удзельнікі сыходзяць са сцэны.

**Дзяўчына**. Ну, усё, даражэнькія. Бывайце,
Варэнікі, бліцы спажывайце,
Ды Масленку ўспамінайце.
**Хлопец**. Мы на святце пабывалі,
Масленку сустракалі.
Наша Масленка гадавая,
Яна госцейка дарагая.
**Дзяўчына**. Трэба нам далей ісці,
Трэба ўсю зямлю прайсці.
Людзям песенькі спяваць,
Людзей з Масленкай вітаць.
**Хлопец**. А вы здаровы бывайце,
Ешце, пейце, грайце,
Ды праз год нас
Чакайце.

Вядучыя сыходзяць са сцэны. Працягваецца канцэртная праграма. На пляцоўцы праводзяцца гульні, частаванне блінамі і чаем. Катанне на возе. Спальванне чучала.

## ДАДАТКОВЫЯ ГУЛЬНІ ДА СВЯТА «РУСІНОЎСКАЯ МАСЛЕНКА»

### ГУЛЬНЯ «МЯТАННЕ МЯТЛЫ»

На глебе праводзіцца лінія, перад якой становяцца 2 удзельнікі. Вядучы дае ім па мятле з дрэўкам. Па камандзе ўдзельнікі павінны кінуць мятлу як мага далей. Хто кіне далей, той і пераможца.

### ГУЛЬНЯ «ТРЫ НАГІ»

Удзельнічаюць 2 пары. Кожнай пары звязваюць ногі: правую нагу аднаго ўдзельніка з левай нагой другога. Пара на «трох нагах» дабягае да паваротнага сцяжка і вяртаецца на лінію старту.

### ГУЛЬНЯ «ПЕРАЦЯГВАННЕ КАНАТА»

Удзельнічаюць 2 каманды. Узяўшыся за канат адна каманда стараецца перацягнуць другую каманду на свой бок.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### ГУЛЬНЯ «ПЕРАЦЯГНІ»

Гулялі па 2 чалавекі. Узяўшыся правымі рукамі за паясы, цягнуць адзін другога ў процілеглыя бакі, стараючыся дацягнуцца левай рукой да кеглі, што стаіць на адлегласці.

### ГУЛЬНЯ «ПАЯСЫ»

Двум удзельнікам даецца саматканы пояс (6 м). Яны бяруць яго за канцы, а вядучы трымае яго пасярэдзіне. Па знаку вядучага ўдзельнікі накручваюць на сябе пояс, а калі дойдуць да сярэдзіны, адразу пачынаюць раскручвацца. Раскруціўшыся, трэба адной рукой узяць пояс за канец, а другую падняць угору. Пераможцам лічыцца той, хто хутчэй справіцца з заданнем.

*Магілёўская вобласць*

Вяззеўскі сельскі Дом культуры

## СВЯТА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ І ДАРОСЛЫХ «МАСЛЕНКА, МАСЛЕНКА, БЫВАЙ, ЗІМА КРАСНЕНЬКА!»

Дзеючыя асобы:

Валачобнікі, Зіма, Мужчына, Хлопцы, Бабка, Бацькі, Дзеці, Вясна

У залу ўваходзяць Валачобнікі.

**Валачобнік 1**. Зіма са снегам, вясна са смехам
Сышлі з дарожкі — бяруцца ў рожкі.

**Валачобнік 2**. Усім людзям паглядзенічка,
Усім людзям пагулянічка!

**Валачобнік 3**. Добрыя людзі, спяшайцеся за намі,
У школе прыбудзе чарга за блінамі!
Да дванаццаці гадзін спячом першы блін,
Да дванаццаці гадзін сабірайся, як адзін.

**Валачобнік 4**. Масленка, Масленка,
Бывай, зіма, красненька!
Пачастуй блінком,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Напаі чайком!
Як белы сняжочак,
Дай сыру кусочак!

**Валачобнікі** (*разам*). Масленка, Масленка!

Валачобнікі запрашаюць дзяцей у карагод.

**Валачобнікі** (*спяваюць*).

А сёння ў нас Масленка, Масленка.
Ой, лялю, рана, Масленка, Масленка!
А з-пад куста ластаўка, ластаўка.
Ой, лялю, рана, ластаўка, ластаўка!
Сядзіць яна высока, высока,
Ой, лялю, рана, высока, высока!
Бачыць яна далёка, далёка,
Ой, лялю, рана, далёка, далёка!
А сёння ў нас Масленка, Масленка.
Ой, лялю, рана, Масленка, Масленка!

Валачобнікі працягваюць вадзіць карагод і прыгаворваюць.

**Валачобнік 4**. А мы Масленку дажыдалі,
Усю нядзельку паглядалі.

**Валачобнік 5**. А мы думалі, Масленка сем нядзелек,
Ажно Масленка сем дзянёчкаў.
Нас Масленка абманіла,
На сем нядзелек паста пасадзіла.

**Валачобнікі** (*разам*). Сырна вам!
Маслена вам!

Усе ўдзельнікі свята спяваюць песню «Масленіца», затым займаюць месцы. На сцэне застаюцца Валачобнікі.

**Валачобнік 1**. Сіні лёд дрыжыць,
Сівы конь бяжыць,
На санях Зіма
Ў кажусе ляжыць.

**Валачобнік 2**. Яна едзе ў даль
На апошні баль,
І за гэта ёй —
Ледзяны медаль.

**Валачобнік 3**. Ля новых варот робіць паварот.
Гэй, дарогу дай, расступіся, народ!

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У залу пад лірычную музыку ўваходзіць Зіма.

**Зіма**.

Шанаванне добрым людзям,
Хай вам радасці прыбудзе.
Хлопцы, дзеўкі, мамы, таты,
Запрашаем вас на свята!
Пра мяне у вас, па праўдзе,
Часта шла гаворка:
Што снег белы вочы крадзе,
Вабяць ноччу зоркі.
Ранак ясны і прыгожы,
Дымы з печы — свечы.
Эй, зіма пацешыць можа
Сэрца чалавеча.
У яе там многа ў штаце
Мастакоў і ткаляў,
Што зімою, як на сваце,
Крочаць снежнай даллю.
Сонца паміж намі —
Дазваляю прычасціцца
Чаем і блінамі.

У залу ўваходзяць карабейнікі і частуюць прысутных чаем і блінамі.

**Зіма**.

Масленка, бела вутка.
Казала Вясна: «Буду, ды няхутка».
Перад тым, як уладу Вясне перадаць,
Запрашаю ў турнірах зімовых свой спрыт паказаць.

Праводзяцца спаборніцтвы.

**Зіма**. А зараз давайце ўспомнім прыказкі і прымаўкі пра Масленіцу і пра галоўны пачастунак гэтага свята — бліны.

Масленіца — палізуха, сыр і масла палізала.
Масленка з блінамі, а пост з грыбамі.
Блін не клін — бруха не распора.
На мазаны блін і кот па-другому глядзіць.
Блінная яда — да вечара хада.
Сядзі, баба, да вечара — табе бліноў напечана.

**Зіма**. Апошнюю прымаўку народ склаў нездарма, бо асобая ўвага ў час Масленкі надавалася бабцы — заснавальніцы роду. Яна была госцем усіх свя-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

точных застолляў. І нам вельмі прыемна, што да нас на свята прыйшла бабуля аднаго з вучняў нашага класа.

Бабуля выходзіць да Зімы.

**Зіма**. Я бачу, што бабуля прыйшла не з пустымі рукамі. Яна цэлы тыдзень рыхтавалася: у панядзелак — у млын ездзіла, у аўторак — з млына муку прывезла, у сераду — муку сеяла, у чацвер — дзяжу ўчыняла, а ў нядзельку — з печы выняла. Вось і пірог атрымаўся! А да яго — сыр з маслам. Дзякуй вам, бабуля, за пірог, а вось і вам наш падарунак.

Зіма ўручае бабулі падарунак і частуе пірагом прысутных. Затым у залу ўваходзіць мужчына з аброццю на шыі. Ён цягне дзіцячыя санкі, на якіх ляжыць барана, накрытая кажухом.

**Мужчына**. Бабка-княгіня, паедзем у карчму, там цябе частаваць будзем!

Два хлопцы выводзяць маладога «жарэбчыка» (на двух старшакласнікаў накідваюць коўдру-«гуньку», апранаюць маску — галаву каня). Гаспадар, узяўшыся за аброць, водзіць яго па крузе. Неаб’езджаны жарэбчык сваволіць, паказвае нораў: танцуе, іржэ, узбрыквае, рвецца на волю. Гаспадар кліча на дапамогу хлопцаў з дубцамі.

**Хлопцы** (*узмахваюць дубцамі і прыгаворваюць*).

Наша Масленка гадавая,
Яна госцейка дарагая.
Яна пешая к нам не ходзіць —
Усе на кошках раз’язджае.
Каб конікі былі вараныя,
Каб слугі былі маладыя.

Улагоджанага «жарэбчыка» запрагаюць у санкі. На іх садзіцца бабка, хлопцы стукаюць-грукаюць качалкамі па пустому вядру. З шумам, крыкам, смехам бабка ад’язджае.

**Бабка** (*спявае*).

Запрагу я шэрага сабаку
Дый паеду ў горад па табаку.
Масленая, шчаслівая,
Расцягніся да Вялікадня! У!
Я думала, Масленкі сем нядзель,
Ажно тае Масленкі — адзін дзень.
Масленая, шчаслівая,
Расцягніся да Вялікадня! У!

Едучы па кругу, бабка сыпле пажаданнямі.

**Бабка**.

Тым, хто радзіўся, каб весяліўся,
Хто пасварыўся, каб памірыўся,
Хто прачакаўся, каб спадзяваўся,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Хто спрацаваўся, каб мацаваўся.
Каб вам шчасця ды здароўя, і дзяціне, і сябрыне!
Каб добрыя людзі на камені і
пад каменем разжываліся,
А ліхія на добрай раллі не раслі.
Каб дзяды не ведалі бяды,
Каб унукі не ведалі мукі!
Каб ніколі рукавок не быў за ручнічок!
Каб вяліся свінні ды авечкі.
І мы жылі, як чалавечкі!

**Хлопец 1**. Каб на тым і стала, што бабка загадала!

Вазок з бабкай ад'язджае,

Зіма выходзіць на сярэдзіну залы.

**Зіма**. Годзе, сняжыначкі, сыпацца з неба,
Цёплага сонца чакае ўжо глеба.
Мы нагуляліся з вамі уволю,
Баб наляпілі са снегу даволі.
Хутка растопяць нас сонца праменні,
Рэк, ручаёў мы пачуем бурленне,
Удосталь нап'ецца матуля-зямліца
Свежай, сцюдзёнай, вясенняй вадзіцы.

Зіме раптам становіцца блага. Яе выводзяць за дзверы. Затым у залу ўваходзіць «жалобная працэсія». Выносяць «труну» (звычайную дошку) з нябожчыцай Зімой (саламянай бабай у старой хустцы і драным андараку). За труной ідуць «няўцешныя» родныя, якія «абліваюцца слязамі», да іх далучаюцца ўсе ўдзельнікі свята, госці. У натоўпе чуюцца роспачныя галашэнні.

**1-ы голас**. А зімачка-а-а, галубачка-а-а,
А на каго ж ты нас сіроткамі пакінула-а-а?
А як жа ты добра на вуліцы стаяла-а-а!
А марозы пякучыя трымала-а-а!

**2-і голас**. А зімачка-а-а, галубачка-а-а,
Хто ж нам, хто хату выхаладзіць?
Хто ж скацінку нашу вымарыць?
Хто ж і жыта наша ў засеках пераесць?

**3-і голас**. А зімачка-а-а, галубачка-а-а,
Што ж мы без цябе рабіці будзем?
Хто ж нам шляхі-сцяжынкі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Замяце-зацярушыць?
Хто ж хатачку пад страху снегам засыпле?
Хто ж у студні ваду за ноч заледзяніць?
Ох, бедныя мы, ох, няшчасныя мы!

**4-ы голас**. А зімачка-а-а, галубачка-а-а!
Чаго ж ты ад нас адышла?
Прымусіла злезці з цёплай печы,
Пра гаспадарку думаці!

**5-ы голас**. Як жа нашы дзеткі без цябе застануцца!
А ці бабу снежную ім зляпіць!
А ні ў снежкі гаротнікам малым пагуляць!
А ні на дарожачцы ледзяной пакоўзацца!

Працэсія выходзіць з залы і набліжаецца да месца на школьным двары, дзе спаляць Зіму. Вучні становяцца ў карагод вакол вогнішча, чучала гарыць.

Гучыць песня «Ой, Масленка-няшчасленка».

Затым бацькі разам з дзецьмі ў карагодзе хорам дэкламуюць.

**Бацькі** і **дзеці**. Гары, гары, жарка, прыедзе кухарка.
Кухарка на карове, кухар — на кабыле,
Дзеці на цялятах, слугі на шчанятах.

Калі чучала згарыць, усе вяртаюцца ў залу, становяцца ў карагод і гукаюць Вясну.

**Бацькі** і **дзеці**. Жаваронačкі, прыляціце, вясну красную прынясіце.
Каб сонейка засвяціла, каб снег белы растапіла.
Каб садзікі расквяціла.
Жаваронačкі, прыляціце, зямлю-матухну абудзіце
І дожджыкам напаіце,
Каб травачкі нарасціла, каб волікаў накарміла.
Жаваронačкі, прыляціце, цёпла лецейка прынясіце,
А зімачку забярыце, бо зімачка надаела —
Наш хлебушак пераела.

Усе садзяцца на свае месцы. Зноў выходзяць Валачобнікі.

**Валачобнік 1**. Благаславі, Божа, вясну-красну.
На ціхае лета, на буйное жыта.

**Валачобнік 2**. Каб наша жыта ў трубы павілося,
У трубы павілося, на бок схілілася.

**Валачобнік 3**. На полі снапамі, а ў гумне тарпамі.
На таку ўмалотна, у арудзе прысыпна.

**Валачобнік 4**. А ў млыне прывольна, а ў дзяжы падыходна,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А ў пячы пячыста, а на стале краіста.

**Валачобнік 5**. Прыйдзі, вясна, прыйдзі, красна,
К нам у таночак,
Прынясі збожжа, прынясі красак,
Каб звіць вяночак.

**Валачобнік 6**. Прыйдзі, вясна, да нас з радасцю,
З вялікай да нас міласцю!

Удзельнікі свята хорам клічуць Вясну.

**Усе**. Прыйдзі, вясна, прыйдзі, красна,
К нам у таночак,
Прынясі збожжа, прынясі красак,
Каб звіць вяночак.

Пад лірычную мелодыю ўваходзіць Вясна, яе суправаджаюць дзяўчаты-вяснянкі.

**Валачобнік 1**. Гэй, Вясна-красна, што ты нам прынесла?

**Вясна**. Я вам прынесла на зямельку травіцу,
На травіцу расіцу,
На лясочак лісточак,
На дзяўчатак вяночак.

Бачу я, што чакалі вы вясновае абуджэнне прыроды. І да свята добра падрыхтаваліся. А бліноў колькі напяклі! Бліны — галоўны пачастунак на Масленіцу, таму што яны вельмі падобныя на сонца, а значыць, дапамагаюць паскорыць надыход цяпла. Я ўдзячна ўсім, хто прыйшоў на свята з блінамі. І на памяць дару вам свае падарункі. Вясна абсыпае прысутных кветкамі, зробленымі з каляровай паперы.

**2-і валачобнік**. Ой, вясна, вясна, ды якая ж ты красна!
Мы для цябе спяваем,
Цябе міла сустракаем.
Спявай жа, браткі, кожны каля сваёй хаткі.
Жаўрук на небе лятае, вясны песеньку спявае.

Выконваецца песня на вясновую тэму.

У заключэнні свята Вясна праводзіць вясёлыя гульні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вяззеўскі сельскі Дом культуры

## НАРОДНАЕ СВЯТА «КУПАЛЛЕ»

Дзеючыя асобы:
Ганна, Мар'я, Вадзяны

Гучыць песня «Калі ласка» ў выкананні народнага ансамбля беларускай песні «Вязанка».

На сцэну выходзяць сяброўкі: Ганна і Мар'я з кошыкамі ў руках.

**Ганна**. Хутчэй, Мар'я, бо на свята спазнімся, і крама закрыецца, а я ж яшчэ нічога не паспела прыкупіць.

**Мар'я**. І навошта я з табой на свята пайшла, лепш бы займалася сваімі справамі.

**Ганна**. Маўчы ўжо ты, лепш дапамажы знайсці кашалёк з грашыма. Куды гэта я яго паклала, можа дзе згубіла?

Мар'я ў руках трымае кашалёк і паказвае Ганне.

**Ганна**. Ах ты шэльма, давай яго сюды.

**Мар'я**. Э-э, не спяшайся сяброўка, перш-наперш адгадай загадкі. Вось табе першая: чатыры вушкі і два брушкі.

**Ганна**. Гэта жаба.

**Мар'я**. Ой, сяброўка, рассмяшыла ты мяне і ўвесь белы свет.

Дзе ты бачыла ў жабы чатыры вушкі і два брушкі?

**Ганна** (*звяртаецца да гледачоў*). Можа хто ведае адказ на гэтую загадку?

**Мар'я**. Добра, слухай другую загадку: па хаце ходзіць, хвастом водзіць. (*Венік*.)

**Ганна**. О, гэта я ведаю, гэта мыш.

**Мар'я** (*смяецца*). Не, не адгадала.

**Ганна**. Ой, што ж гэта робіцца? Людцы добрыя, дапамажыце, а то яна мне мой кашалёк не аддасць, і што мне ў краме без грошай дадуць?.. Вялікі дзякуй, дапамаглі.

На сцэну запрашаюцца тыя, хто адгадаў загадку.

**Мар'я**. Ага, ёй дапамаглі, цяпер дапамажыце і мне.

**Мар'я**. Вось трымайце, даражэнькія, па ветачцы купальскай. А ці хадзілі ж вы ўчора ў лазню?



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Удзельнікі адказваюць.

**Мар'я**. А мы зараз пабачым, ці можаце вы самі сабе зрабіць венік?

ГУЛЬНЯ «ВЕНІКІ»

Выносіцца бярозавае вецце і раздаецца ўдзельнікам. Па камандзе кожны ўдзельнік павінен зрабіць сабе венік. Хто хутчэй і прыгажэй зробіць, той і пераможа.

**Ганна**. Бачыш Мар'я, якія ў мяне памочнікі, аддавай мой кашалёк.

**Мар'я**. Але ж, даражэнькая мая, венікі яны зрабілі, але каб у лазню ісці, то трэба мець мыла. Вось вам падарункі.

**Ганна**. Пойдзем хутчэй, бо крама закрыецца.

Выходзяць са сцэны.

Музычны нумар.

**Мар'я**. А ці чула ты, Ганна, хоць адну легенду звязаную з Купаллем?

**Ганна**. А што такое легенда, гэта навука якая?

**Мар'я**. Ой, даражэнькая, дык ты ж зусім цёмная баба. Ёсць розныя легенды, якія складалі нашы продкі стагоддзямі. У першую чаргу легенда пра папараць-кветку: той, хто яе адшукае, можа авалодаць усімі зямнымі скарбамі і будзе самы шчаслівы на свеце.

**Ганна**. Якая прыгожая легенда. Пайду і я папараць-кветку шукаць.

**Мар'я**. Стой! Куды ты? Ці ведаеш ты, што гэтая кветка цвіце ў лесе ноччу, але знайсці яе можа толькі малады і смелы чалавек, які не баіцца ўсякай нячыстай сілы. Бо ў гэтую ноч уся нячыстая сіла перашкаджае гэтай справе.

**Ганна**. А памятаеш, у прошлым годзе колькі людзей патапілася ў рэчцы?

**Мар'я**. Дык гэта ж усё Вадзяны!

**Ганна**. Ай, я яго не баюся. Хто ён такі? Я ўсё роўна пайду шукаць папараць-кветку, бо я даўно ўжо мару замест лыскі «Таёту» купіць, а замест бульбы «Снікерсы» есці.

**Мар'я**. Ой, Ганна, ты так смела пра гэта гаворыш... Глядзі, прыйдзе да цябе гэты нячысцік...

**Ганна**. Ай, усё... пайшла я...

Ганна ідзе шукаць папараць-кветку.

Мар'я застаецца на сцэне, глядзіць у след сяброўцы, перажывае, заве назад, пытае, дзе яна...

Музычны нумар.

Раздаецца страшная музыка для выхаду Вадзянога. Ганна бяжыць назад з крыкамі.

**Ганна**. Людцы, ратуйце! За мной нячысцік гоніцца!

**Мар'я**. Што? Што, мая сяброўка, здарылася?

**Ганна**. Там... (*паказвае жэстамі, каго яна ўбачыла*).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мар'я не можа зразумець. У гэты час з'яўляецца Вадзяны.

**Ганна** (*паказвае на Вадзянога*). Вось яно, глядзі!

Мар'я страчвае прытомнасць, Ганна кідаецца да Мар'і.

**Вадзяны**. Вось, дурная баба! Чаго ты равеш? Напалохала мяне і ўвесь белы свет! Не відаць вам сёння свята!

**Мар'я** (*да Вадзянога*). А як гэта ты нам перашкодзіш?

**Вадзяны**. А я пагашу святло, а калі вы пачнеце паліць вогнішча, нашлю дождж. Калі ён не пагасіць вогнішча, тады я сам яго залью гэтым апаратам-агрэгатам.

**Ганна**. Злітуйся над намі, пан Вадзяны.

**Вадзяны**. Добра! Але давайце спачатку пагуляем у маю гульню. Тады і пабачым...

**Мар'я**. О, у гульні мы гуляць мастакі! Якая ў цябе гульня?

Вадзяны расказвае правілы гульні. Патрабуюцца лыжкі, талеркі з вадой, стаканы.

Удзельнікі пераносяць ваду з міскі ў стакан з дапамогай лыжкі.

**Вадзяны**. Малайцы, добра згулялі! Дапамагу я вам правесці свята. А той смелы, хто знойдзе папараць-кветку, якую я схаваў на тэрыторыі клуба, атрымае падарунак і будзе самы шчаслівы ў гэтым годзе. Поспехаў вам!

Музычны нумар.

**Мар'я**. Ведаеш, я ўчора ў лесе была, грыбоў назбірала, ледзь да хаты дайшла і сёння пайшла б, каб ты мяне на свята не пацягнула. А грыбоў там відзьма-нявідзьма, вунь аж адсюль відаць.

**Ганна** (*у бок*). А я адна ў лес не пайду. Людцы добрыя, хлопцы маладыя, дапамажыце мне грыбоў назбіраць.

На сцэну выходзяць удзельнікі гульні «Збор грыбоў».

Гучыць вясёлая музыка для конкурсу.

ГУЛЬНЯ «ЗБОР ГРЫБОЎ»

З завязанымі вачыма трэба сабраць як мага больш грыбоў, якія выраслі ў лесе. Хто хутчэй і больш назбірае, той і пераможца.

**Мар'я**. Вось як добра пагулялі! Ой, Ганна, паглядзі, што гэта за дзяўчаты да нас ідуць?

**Ганна**. Дык гэта ж нашы вясковыя дзяўчаты разам з хлопцамі. Мабыць, дзяўчаты спяваць ідуць, пойдзем, не будзем ім перашкаджаць.

Ганна і Мар'я сыходзяць са сцэны, выходзяць дзяўчаты.

Музычны нумар.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Блок песен.

**Ганна**. Я з гэтымі песнямі нашу маладосць успомніла. Некалі ж і мы весела адпачывалі, маглі песні спяваць, танцы танцаваць, гульні гуляць.

**Мар'я**. Так Ганна, я з табой згодна. Давай крыху пагуляем, люблю я гэтую справу.

**Ганна**. Вось тут вы бачылі, як прыгожа спявалі нашы дзяўчаты, а няўжо сярод вас не знойдзецца певуноў?

ГУЛЬНЯ «ПРЫПЕЎКІ»

Музыка для прыпевак. Падрыхтаваць на картках прыпеўкі.

**Мар'я**. Вось, як весела мы час праводзім, а давайце яшчэ паслухаем, як спяваюць нашы Вяззеўскія артысты.

Музычны нумар.

ГУЛЬНЯ «СПЛЯЦІ ВЯНОК»

**Ганна**. Якія прыгожыя дзяўчаты, як тыя кветачкі, што ў іх у руках. І мы павінны зараз з іх сплесці два вяночкі. Для гэтага падзелімся на дзве каманды. З гэтай колькасці кветак, якую маеце, кожная каманда пляце вянок.

Гучыць вясёлая музыка для конкурсу.

**Мар'я**. Дзякуй за гульню.

**Ганна**. Ой, якія спрытныя дзяўчаты. А якія ж яны прыгожыя вянкі сплялі!

Прымярае вянок да сваёй галавы.

**Мар'я**. Ой, людцы добрыя, паглядзіце на гэтую кабету. Ён жа табе, як карове сядло. Цябе твой Яўхімка сустрэне і не пазнае. Маладзіца знайшлася, здымай хутчэй.

**Ганна**. Чаго ты да мяне прычапілася, ці можа зайздросціш маёй прыгажосці?

**Мар'я**. Ой, няма патрэбы зайздросціць, за мной і цяпер мужыкі гужам ходзяць.

**Ганна**. Каго гэта ты называеш мужыкамі, можа Федзьку, які п'е кожны дзень не прасыхаючы і да цябе ходзе грошы пазычаць; ці можа Грышку, які год 50 бабылём ходзіць?

**Мар'я**. А хоць і іх, дык што яны не мужыкі? А вось давай паглядзім, хто сабе хутчэй мужыкоў набярэ.

ГУЛЬНЯ «ПЕРАЦЯГВАННЕ КАНАТА»

Жанчыны ідуць шукаць мужыкоў, кожная бярэ сабе па тры мужыкі.

**Мар'я**. Ну вось, а цяпер давай паглядзім, чые мужыкі дужэйшыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праводзіцца гульня, раздаюцца прызы.

Музычны нумар.

Мар'я выносіць на сцэну гіру.

**Ганна**. Ну дуркаватая баба, знайшла час спортам займацца.

**Мар'я**. Не языком бы малола, а лепш дапамагла б.

**Ганна**. Ну яшчэ чаго ўздумала, ахвота мне кішкі рваць, табе трэба, ты і цягні.

**Мар'я**. Дзякуй табе, суседачка, на добрым слове, добра, добра, папросіш ты ў мяне карову тваю падаіць, пагляджу, як я табе пабягу.

**Ганна** (*схамянуўшыся*). Ой, зараз, зараз, суседачка, нашто ж ты такі цяжар адна цягаеш, у мяне б папрасіла, я б з ахвотай дапамагла б.

ГУЛЬНЯ «ПАДНЯЦЦЕ ГІРЫ»

**Мар'я**. Ну вось, а зараз нам патрэбна чатыры дужыя хлопцы, якія пакажуць сваю моц у падняцці гіры.

**Ганна**. Малайцы, хлопцы, ёсць яшчэ волаты і ў нашай вёсцы.

Музычны нумар.

Пасля запальваецца вогнішча.

**Ганна**. Паслухай Мар'я, што гэта тут робіцца, нешта запалілі, пакуль мы з табой хадзілі, цягні хутчэй вогнетушыцель, будзем тушыць пажар (*хоча бегчы, Мар'я яе спыняе*).

**Мар'я**. Куды ты пабегла, як ашалелая? Ганначка, гэта ж вогнішча купальскае, нашы продкі верылі, што агонь мае ачышчальную сілу, і ў ім згарае ўсё дрэннае, што перашкаджае нам жыць!

**Ганна**. Вось як, цікава, а я думала...

**Мар'я**. Такое ўяўленне, суседачка, што ты ўсё жыццё пражыла ў лесе і ніколі з яго не выходзіла, нічога ніколі не бачыла, нічога ніколі не чула... цемра!

**Ганна**. Ну, ты глядзі мне, папрашу не абражаць.

**Мар'я**. Добра, добра, не хвалюйся, давай лепш песню добрую паслухаем.

Музычная паўза.

**Мар'я**. Дзякуй табе, Ганначка, што выцягнула мяне на свята, я хоць людзей пабачыла, ды сябе паказала.

**Ганна**. Ну вось, а ты не хацела ісці, але ж нам дадому трэба збірацца.

**Мар'я**. Як дадому, ну давай яшчэ крыху застанемся...

**Ганна**. Ну добра, калі ты так просіш, а вас, людцы добрыя, яшчэ раз віншуем са святам Купалля і запрашаем на танцы.

Праводзіцца дыскатэка.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Гродзенская вобласць*

Верцялішкаўскі цэнтр культуры і вольнага часу

## НАРОДНАЕ СВЯТА «ЗАЖЫНКІ–2015»

Дзеючыя асобы:

Вядучыя, Жанчыны, Камбайнёр, Аграном

Свята пачынаецца з урачыстай сустрэчы камбайнёраў, шафёраў, якія пад'язджаюць на сваіх камбайнах, упрыгожаныя стужкамі, кветкамі. Выходзяць з машын. Іх вітаюць маладыя дзяўчаты, апранутыя ў белае адзенне, на галаве вяночкі з кветак.

**Вядучы 1**. Добры дзень, людзі!
**Вядучы 2**. Добры дзень, ніва залатая.
Зямелька ўранку спрасонку.
Дыміцца ружовай зарой
Пад ветрам гарачым, пад сонцам
Даспела жыта за сялом.
**Вядучы 1**. Сабраліся ўсе мы сёння
Сюды, дзе шуміць збажына,
І просіць нас голасам спелым
«Прыходзьце хутчэй зажынаць».
**Вядучы 2**. Жыта нас паклонам вітае,
Страсаючы кроплі расы,
Цяжкія галовы схіляюць
Да самай зямлі каласы.

**Вядучы 1**. Сабрала сёння нас сюды поле спелае, поле жытнёвае, і гасцей, і гаспадароў, і шафёраў, і музыкантаў, і дзяўчат, што спяваюць хорам, хорам спяваюць, ніву праслаўляюць.

Гучыць песня.

**Вядучы 2**. Радзі ярыну капамі,
Радзі, сонца, жыта і пшаніцу.
Поўна поле стагамі.
Радзі, сонца, жыта і пшаніцу.
Поўны гумны стагамі.
Радзі, сонца, жыта і пшаніцу.
Поўны клеці карабамі.
Радзі, сонца, жыта і пшаніцу.
Поўны печы пірагамі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Вядучы 1** (*выходзіць з хлебам на рушніку*).

Наш шчыры хлеб,
Надзённы хлеб,
Ва ўсе вякі ён быў няпросты,
Спрадвеку ззяе свежы бохан
Вялікім шчасцем на стале.
З надзеяй дажынаць іду
І нізка кланяюся полю,
Такому роднаму да болю,
Што знала гора і бяду.

Жанчыны ў белым бяруць у рукі па некалькі каласочкаў і гавораць разам.

Сам бог жыта зажаў і нам паказаў.
Вялікія снапы вязаў і нам паказаў.
Частыя копы стаўляў і нам паказаў.
Што горачка — то й копачка,
Што лужочак — то й стажочак.

Збіраюць усе каласкі ў адзін снопік і ўпрыгожваюць кветкамі.

**Жанчына**. То добры дзень табе ніўка — ядронае жыта, мы сёння к табе прыйшлі, сярпы ўзялі, а нажнём мы толькі адзін, першы зажыначны сноп, на сто коп, на тысячу мерак, а потым нізка паклонімся камбайнёрам. Падзякуем нашаму начальству, што сярпы з нашых рук забралі, нашы рукі і спіны ўжо не баляць, жыта жнучы, у снапы вяжучы, на такі цягаючы, цапамі махаючы. Каб і на далей так было, каб усе здаровенькія пажывалі і гатовы хлеб паядалі.

Дзякуем і нашаму старшыні, і раённаму начальству, што як бы не было цяжка, камбайн новы набылі і старыя адрамантавалі. (*Кланяюцца ўсім, сноп аддаюць старшыні.*)

**Усе жанчыны**. Радзі, божа, жыта
На другое лета.
Радзі, божа,
На другое лета,
Лепшае за гэта.
Радзі, божа.
Па полі снапамі, у гумне тарпамі,
Радзі, божа.

Жанчыны бяруць хлеб.

**Вядучы 2**. Стаўлю сноп сто коп, на тысячу мерак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адламлівае жанчына кусок ад хлеба і кладзе яго на ржышча пад сноп, а старшыня закрывае сноп рушніком.

**Вядучы 1**. Пакрылі ніўку, на добрую спажыўку,
Памажы божа, убраць збожжа.
**Усе**. Крыта, крыта, поўна жыта.

Жанчына бярэ хлеб і падыходзіць да камбайнёраў, ламае на кавалкі.

**Жанчына**. Пачастуйцеся, родненькія, з мякішам-скарыначкай.
Набярыцеся моцы, каб шчасліва новы хлеб набываць.
Дзякуй богу і вам, былі мы з хлебам
да новага ўраджаю.
Спрадвеку зямля карміла, людзей жывіла.
Разам з намі бедавала, разам з намі спявала,
Любіце зямлю, беражыце, яна вам аддзячыць.

Песня.

**Вядучы 1**. Досыць, досыць ядронаму жыту ў полі стаяці,
Пара, пара па ядронаму жыту камбайнам гуляці,
Пара, пара ядронае жыта ў засек засыпаці.
**Вядучы 2** *(слова ад лепшага камбайнёра мінулага года).*
Маё сяло, маё раднoе, я свой, я сельскі чалавек,
Адзінай марай, адзіным хлебам
З табою звязан я на век.

Прадастаўляецца слова кіраўніку раёна.

Дзяўчаты дораць свае вянкі старшыні і кіраўнікам раёна, усім, хто выступае.

Песня.

**Вядучы 2**. Хлеба налева, хлеба направа,
Хлеба на шчасце, хлеба на славу.
Жыў ён у полі ўсю вясну,
Дзела к лету,
Як да яго я не прыйду,
Дома нету.
Хто гэта? Канешне, аграном.
*(Слова аграному.)*
**Вядучы 1**. Блакіт нябёс, і белы бусел,
І кветкі ў полі, як абрус.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мой край завецца Беларуссю.
Хай будзе з хлебам Беларусь.

Прыміце наш нізкі паклон усе, хто здабывае гэты хлеб.

Мы нізка кланяемся за вашу працу, за тое, што мне казалі — цяжка, з радаснай надзеяй засявалі поле моцнаю рукою.

І зямля, як маці, шчодра нас надзеліць.

Глянь — калоссе долу хіліцца цяжкое, і дзявочы голас звініць над лясамі.

**Вядучы 2**. Будзем, будзем з хлебам зімку зімаваць.
Сёння ў нашым полі загулі камбайны,
Хлебнае багацце паплыве ў гумны.
А пасля мы справім слаўныя дажынкі.
Будуць ляцець песні за лясы высока.
Нізка, нізка жыта хіліцца ў полі.
Каласы набраклі бурштынавым сокам.

**Вядучы 1**. Ай, добры дзень, шырокае поле,
Жыта ядронае, добрая ноч,
На здароўе, камбайнёры маладыя,
Коні стальныя, на здароўе.
Прыходзьце заўтра раненька,
Як сонейка ўзойдзе, прыходзьце.
Вы сажніце шырокае поле,
Жыта ядронае, да сажніце,
І дай, божа, добрае надвор’е
На вашу работу.

**Разам**. Да сустрэчы на дажынках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прудкоўскі сельскі Дом культуры

## ВЯСЕЛЬНЫ АБРАД «ПРУДКОЎСКАЕ ВЯСЕЛЛЕ»

Дзеючыя асобы і выканаўцы:

Малады князь, Маладая княгіня, Бацька і Маці маладой, Хросная маці і Хросны бацька маладога, Сваты, Музыка, Барабаншчык, Вясельніцы, Пасцельніца, Дружкі, Маршаўкі, Свяцёлка, Брат маладой, Сястра маладой, Вядучая

Памяшканне абсталявана і ўпрыгожана як старажытная хата палешукоў: з левага боку стаіць печ, каля печы ступа з пястом, далей засланая посцілкай канапа, з правага боку зроблены на вугал покуць з іконамі, паводаль засланы ложак з гарой вышытых падушак, на сценах вісяць вышытыя рушнікі, посцілкі, вышытыя карціны. На авансцэне стаяць вясельныя сталы, засланыя вышытымі абрусамі, на сталах у гліняных місках пачастункі. Уздоўж сцен стаяць драўляныя лавы.

**Вядучая**.

Ёсць на свеце дзве радугі,
А ў нас сёння дзве радасці.
Першая радасць — сына жэняць.
Другая радасць — дачку замуж аддаюць.

У куце каля покуці сядзіць Маладая з Дружкамі. Каля яе — Вясельніцы, Бацька і Маці завіхаюцца ля сталоў.

**Гурт спявае**.

Зялёная рутачка, жоўты цвет.
Пыталася Ганначка:
— Ці ўжо свет?» (2 *разы*)
Чаго майго Іванкі доўга нет?
Ці ж я яму вяночак не звіла?
Ці ж я яму хустачку не дала?
Звіла яму вяночак з рутанькі,
Дала яму хустачку з ручанькі.

На вуліцы чуецца песня дружыны Маладога князя.

Пачуўшы гэту песню, Маці маладой таўчэ ваду ў ступе.

Застукалі конікі на памосце,
Прыехалі к Ганначцы ды ўжо госці.

А вы нашых конікаў прывяжыце.
Маладую Ганначку пакажыце.

Жанчыны з Дружкамі выводзяць Маладую, садзяць яе на лаву перад сталамі, Дружкі прыхарошваюць і надзяваюць ёй на галаву вясельны вянок са стужкамі.

**Гурт спявае**. Вы, дружачкі мае, вы дружачкі мае,
Захавайце ж вы мяне (2 *разы*)
Ды за сцены каменныя.
За сцены каменныя, (2 *разы*)
За сталы цясовыя.
Ехаць мне мой свёкар (2 *разы*)
Забіраць мяне далёка.
Перапой даваць будзе (2 *разы*)
Ды мяне пытаць будзе.
Перапой не бярыце (2 *разы*)
Дый мяне не кажыце.

За сцэнай чуецца музыка, гучаць званочкі.
Гурт Маладога з песняй заходзіць на парог хаты.

Прыбілася рыбка к гату (2 *разы*)
Пусці, свату, у хату.
Мы ж цябе не згубім, (2 *разы*)
А возьмем, што злюбім.
Вып’емо па кубачку (2 *разы*)
Ды схопім галубачку.
Вып’емо, падскочымо, (2 *разы*)
Дый схопім, што схочымо.

**Хросны бацька маладога**.
Пусці, свату, у хату,
Хоць рукі пагрэці.
На маладую паглядзеці.

**Маці маладой**. Добры вечар, людзі чужыя,
Ох, якая ў вас вялікая дружына.

**Хросная маці маладога**. А мы госцейкі небывалыя,
небывалыя, дый пахажалыя.
Прыскакаў наш конік-скакунок.
Адчыняй вароцейкі, наш сваток!

**Дружына маладой спявае**.
Нашы свахі чохі-чохі, (2 *разы*)
Пагубілі панчохі.
Як панчохі знайшлі (2 *разы*)



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Самі пешкі пайшлі.
Маладога ў мяшку неслі, (2 *разы*)
Дый яго растрэслі.
А ногі тырчалі, (2 *разы*)
Сабакі гірчалі.

**Дружына маладога спявае ў адказ**.

Нашы свашкі, малыя пчолкі, (2 *разы*)
Языкі ў іх, як качолкі.
Брашыце, брашыце (2 *разы*)
Аб кол языкі чашыце.

Хросная маці маладога падводзіць Маладога да Маладой.

***Хросная маці маладога***.

Станавісь, князь малады, ды разам з княгіняй маладой,
Ды так, каб болей вам не разлучацца,
Адзін на аднаго не налюбавацца.
Звіваем вам рукі, поясам-павоем,
(*Звязвае рукі маладых поясам.*)
Каб вы заўсёды былі двое,
Многа дзетак нажылі,
Разам ў пары пражылі
На лес добры, на век доўгі.

Брат маладой бярэ хустачку і вядзе за сабой Маладую на пасад. За Маладой ідзе князь.

**Вядучая**. Лятуць, лятуць два лебедзі цераз сад,
Вядуць, вядуць нашу Ганначку на пасад.
Яна свайго пасадзіку не знае,
Ды ў роднай матулькі пытае:

**Маладая**. Ой, ці будзеш, матулька, мяне ждаць?
Ой, ці будзеш, матулька, ноч не спаць?
Дый сваю дачушку ўспамінаць?

Маці маладой пасыпае Маладых жытам, каб дзеці былі, Бацька падносіць мёд на талерцы, каб жыццё было салодкім.

**Маці маладой**. Заходзьце за сталы, добрыя людзі,
каб у нашых маладых было здароўя поўныя грудзі.

У гэты час заходзіць за стол Сяцёлка з двума запаленымі свечкамі, загорнутымі ў рушнік, сядае з боку Маладой. Госці частуюцца.

**Гурт запявае песню**.

Зялёная вішня з-пад кораня выйшла,
Аддала ж мяне маці, дзе я не прывычна. (2 *разы*)



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ой, выйду на гору, дай клікну да дому:
— Вары, маці, вячэру шчэй на маю долю, (2 *разы*)
Вячеру варыла, не мала, не трошкі.
Няма табе, доню, не міскі, не ложкі (2 *разы*)

**Вясельніца**. Ой, жоначкі, вельмі ж сумную песню вы запелі.
Давайце лепш паскачам «Лявоніху».

**Усе**. Заграй, заграй, музыка!

Танец «Лявоніха».
Жанчыны падпяваюць прыпеўкі, госці скачуць. Напрыканцы танца выходзіць хлопец, які нясе, прытанцоўваючы, упрыгожаную елачку.

**Гурт спявае**. Ой, ты, елачка барава,
У бары стаяла, шумела. (2 *разы*)
Дарогай ішла, звінела. (2 *разы*)
Дарогай ішла сіяла. (2 *разы*)
А ў хату ўвайшла, заўяла. (2 *разы*)
На стале стала, заззяла.

Дружкі ў іншых выкупаюць елачку, якую ставяць на стол.

**Маці маладой**. Што вы, госцейкі, не п'яцё, не п'яцё,
Што вы, госценькі не ясцё, не ясцё?

**Жанчына**. А мы ўсе папілі і паелі, і скакаць захацелі!
Давайце паскачам нашу прудкоўскую кадрылю.

Танец «Кадрыля» (на пяць каленаў).

**Жанчыны**. Ох, добра мы паскакалі.
Адно смагу нагналі.
Ой, Свату, якая ў цябе гарэлка горкая!

**Вясельнікі падтрымліваюць**.
Горкая! Горкая! Горкая! Горкая!

Маладыя ўстаюць і цалуюцца вельмі сарамліва.
Сваты запрашаюць гасцей частавацца.

**Гурт спявае**. Я па садзіку хаджу, сама сабе гавару:
— Аддалі ж мяне замуж на чужую старану, (2 *разы*)
На чужую старану, дай у вялікую сям'ю.
А вялікая сям'я ўся вячэраць пасела, (2 *разы*)
А мяне ж маладу пасылаюць па ваду. (2 *разы*)
Як па воду я пайшла, зачарпнула паўвядра,
А дадому ішла, то слязамі даліла, (2 *разы*)
Паставіла ля сяней, сама стала ля дзвярэй.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дай паслухаю я, што гавораць пра мяне. (2 *разы*)
А вялікая сям'я навучае мужыка:
— Чаго жонку б'еш, чаго волю ёй даеш?

Сваха перавязвае Сватоў рушніком, перад гэтым палівае ім на рукі.

**Вядучая**. Каб жыццё дваіх было шчаслівым,
Цераз сем мастоў ім пераехаць.
Сем дарог ім за сабой аставіць.
У той час па старому павер'ю
Радуга ўзыдзе над дарогай.
Дзве любві ў адну саедзіняем,
Дзве дарогі ў адну зліваем.

Галоўны сват прытанцоўваючы ідзе да Маладых з караваем, які трымае над галавой на рушніку, два Сваты прытанцоўваючы ідуць за ім.

**Гурт спявае**. Караваю наш раю, караваю наш раю.
Каля цябе хараша іграю.
Са скрыпкамі, баянамі, (2 *разы*)
З багатымі прыданымі.

**Сват**. Бацька і Маці, што нарадзілі дачку ў гэтай хаце, дазвольце каравай благаслаўляці. Першым разам.

**Усе**. Бог благаславіць!
**Сват**. Другім разам!
**Усе**. Бог благаславіць!
**Сват**. Трэцім разам!
**Усе**. Бог благаславіць!
**Гурт спявае**. Ой, рано, рано, да ўгадайце, баярэ!
Ой, рано ж рано, да, што ў нашым караваe!
Ой, рано ж рано, да з сямі палёў пшаніца. (2 *разы*)
Ой, рано ж рано, да з сямі крыніц вадзіца. (2 *разы*)
Ой, рано ж рано да з сямі каровак масліцо. (2 *разы*)
Ой, рано ж рано, да з сямі курачак яечко.
Ой, рано ж рано, прыступайце, баярэ,
Ой, рано ж рано, каравай наш краіці.

Сват ставіць каравай на стол, зразае з яго шышачку і падае Маладым.

**Сват**. Як у нашай Маладой, лебядзі залатой, да ёсць родныя Бацька з Маткай. Просім іх ласкавымі быць, на каравай прыбыць! Не так на каравай, як на дар божы.

Бацькі пад музыку выходзяць.

**Бацька**. Я дарую ніву жыта, каб не была наша дачушка біта.
А яшчэ асмушку солі, каб не ведала гора ніколі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Маці**. Мы даруем свінку, кароўку, да кроўкі вяроўку,
А яшчэ зялёнага дуба, каб жылі нашы дзеткі люба.

**Вясельнік 1**. А я дарую куру-квактуху, каб нявеста пацалавала свякруху.

**Вясельнік 2**. А я дарую зялёную рошчу, каб зяць пацалаваў цёшчу.

**Вясельнік 3**. А я дарую чыгун паронак, каб Іван не хадзіў да чужых жонак.

**Вясельнік 4**. А я дарую маладым кашэль буракоў, каб не любіла Ганначка чужых мужыкоў.

**Вясельнік 5**. А я жадаю маладым, колькі ў лесе пянькоў, каб у іх было столькі сынкоў!

**Вясельнік 6**. А я дарую загон жыта, не знаю, дзе яно расце, а вы жніце, ды мяне за бабу вазьміце!

Сваты надзяляюць усіх караваем. Госці частуюцца.

**Сваха**. Бацька і маці, і ўся радзіна! Благаславіце Маладую завіваці.

Свахі ўзмахваюць над галовамі Маладых хусткай, пакрываюць іх галовы і стукаюць адна аб адну.

**Сваха**.
Першым разам! Бог благаславіць!
Другім разам! Бог благаславіць!
Трэцім разам! Бог благаславіць!
Распляцём касу нашай дзевачцы,
Ды аддадзім уплёты яе мамачцы.
Няхай яна іх разгорне,
Ды к сэрцу прыгорне!

Сваха здымае з галавы Маладой вянок і падае яго Маці, якая кладзе вянок на покуць. Сваха мажа косы маслам, пасыпае іх макам-ведуном, прыказваючы.

**Сваха**. Пасыплю табе косы макам-ведуном, каб не прыставалі да цябе сурокі, прырobкі, каб дзеткі былі, як макаў цвет.

Закручвае касу, павязвае на галаву хустку, вясельнымі свечкамі тры разы абводзіць вакол галоў Маладых.

**Гурт у гэты час спявае**.
Ой, была ж ты, Ганначка,
Дый дзявіца,
А цяпер ты, Ганначка, маладзіца.
З добрага цеста добра пеляніца.
З харошай дзеўкі добра маладзіца.

**Сваха**. Бацька і Маці, і уся радзіна, благаславіце свечы тушыці.
Першым разам! Бог благаславіць!
Другім разам! Бог благаславіць!
Трэцім разам! Бог благаславіць!

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сваха бярэ каравай хлеба і ім тушыць свечкі, заварачвае свечы разам з караваем, якім яны тушыліся.

**Сваха** (*звяртаецца да Маці маладой*). Ну што ж, свашка дарагая, збірай дачушцы прыданае.

**Гурт спявае**.
Заграбай, мамка, жар, жар,
Заграбай, мамка, жар.
Будзе табе доньцы жаль.
Выграбай, мамка, попел. (2 *разы*)
Мы тваю дачушку схопім.
Закутай, мамка, у юшку (2 *разы*)
Аддавай доньцы падушкі.
Ды кладзі іх на сані, (2 *разы*)
Няхай едуць з намі.

Госці танцуюць вакол клунка з прыданым, які Маці ўручае Пасцельніцы.

**Маці маладой**. Паглядзіце, сваточкі, якую я вам выгадавала дачку, працаўніцу. І ткаць, і прасці, і вышываць здатная. І гаспадарку даглядае, і гарод абрабляе. Бачыце, колькі прыданага нарыхтавала. А на возе яшчэ цэлая скрыня багацця стаіць.

**Госці Маладой** (*пяюць*).
Дадому госцейкі, дадому,
Паелі конікі салому.

**Госці Маладога** (*у адказ*).
Прывязалі чэрці да свіное жэрдзі,
Не паедзем.

**Сваха**. Бацька і Маці, і ўся радзіна, благаславіце маладых з-за стала выводзіці.
Першым разам! Бог благаславіць!
Другім разам! Бог благаславіць!
Трэцім разам! Бог благаславіць!

Сваха выводзіць з-за стала Маладых. Развязвае ім пояс-павой. Маладая становіцца перад Бацькам на калені, Малады князь стаіць, схілішы галаву. Дзяўчына галосіць, прычытае.

**Маладая**. Ой, татачка мой родненькі, благаславі ты мяне сваю дачушку, бо мне ісці ў чужую старану, дый у вялікую сям'ю.

Бацька перахрышчвае дачку іконай, тая яе цалуе.
Дачка, галосячы, звяртаецца да Маці.

**Маладая**. Ой, мамачка мая, зязюлечка мая, а ты ж мяне гадавала, а ты ж начэй не спала. А мне з хаты роднай ісці, ды ў людзі чужыя, у старану далёкую. Благаславі мяне, мамачка!

**Маці маладой**. Благаслаўляю, цябе, дачушка, на шчасце і долю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(*Перахрышчвае маладую і просіць.*)

**Маці маладой**. Ой, сваточкі, галубочкі, просім вас,
Каб не была ёй паветачка за хатку,
Каб не была ёй суседачка за матку

(*Дачка ўстае з кален, маці дае ёй ікону.*)

**Гурт спявае**. Адступіцеся, варагі, дый не пераходзьце дарогі.
Няхай пяройдзе Гасподзь Бог.
Дый яшчэ мой баценька напярод.
Няхай пяройдзе мамка мая,
Каб нам дарожка гладка была.
Няхай пяройдзе радзіна,
Каб была дарожка шчаслівая.

На апошніх радках песні Маладыя рухаюцца да выхаду.

Перад імі ідзе Свацёлка, якая нясе ў рушніку вясельныя свечы з хлебам, з боку ідуць Хросныя бацькі.

Шэсце замыкае Пасцельніца з прыданным.

**Гурт спявае**. Прапіла маці дочку, прапіла маці дочку...

*Гомельская вобласць*

Прудкоўскі сельскі Дом культуры

## АБРАД «ПРЫСВЯЧЭННЕ» І БЕЛАРУСКІЯ ВЯЧОРКІ

Дзеючыя асобы і выканаўцы:

Гарпадар, Гаспадыня (касцюм цяжарнай жанчыны), Баба (касцюм свякрухі), Кума (касцюм удавы), дзеці: Марылька, Янка, Тэкля, Дзяўчына (строй дзяўчыны з парнымі кветкамі), Хлопец Якаў, Зоська, Маладзіца з немаўляткам, Мікіта, Мікіціха, Музыка, Маладзіцы

Сялянская хата. У хаце жанчына (маці), бабуля.

Жанчына завіхаецца каля печы, бабуля сядзіць на лаўцы.

**Бабуля**. Ну вось, дзякуй Богу, дажылі да дня, калі дзеткам споўнілася 6 гадоў.

**Маці**. Дзякуй Богу. Не могуць даждацца, калі скінуць кашулі. Вунь на вуліцы выглядаюць Хросную. Яна ж ім пашыла новае адзенне.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Бабуля**. Дык яно ж так. Год ад года. Як народзіцца дзіця, і да шасці год колькі адбываецца перамен у адзенні. Спачатку — пялюшкі, на хрэсьбіны — кашулька, калі падстрыгалі першы раз, у год, то кашульку новую мянялі. Ды ўсе з ношанай тканіны. А вось ужо дараслі нашы Янка і Алеська да таго часу, што надзенуць адзежыну сапраўдную. Ужо не буду я блытацца, калі здалёк глядзець. А то і той, і другі ў кашульках, не разабраць дзе хто.

**Маці**. І праўда, усё трэба было шыць ім са старога, ношанага.

**Бабуля**. Дык спрадвеку так. Першыя кушулькі з матчынай сарочкі шыюцца, каб дзеці не хварэлі. Яна як абярэг для дзіцяці, перадае яму ўсю матчыну сілу і здароўе. А не дай Бог захварэе, зноў жа, кашульку патрэбна павесіць каўняром уніз.

**Маці**. Яно так. А потым хвартухі надзенуць, як замуж ісці.

Убягаюць дзеці.

**Алеська**. Мамачка, ідзе, ідзе Хросная. Нясе!

**Янка**. А кашолка вялікая. Там мае штаны нясе!

**Маці**. Сціхніце, гарэзы! А то гасцінцаў не атрмымаеце!

Уваходзіць Хросная маці.

**Хросная**. Добры дзень у хату!

**Крэсціцца**. Дзеці кідаюцца да яе.

**Янка**. Хросная штаны пашыла?

**Алеська**. А мне спаднічку?

**Хросная**. Пашыла, пашыла. Старалася, каб угадзіць. Папрыбіраю вас. Будзеце, як галубкі.

Дзеці ў кашолку з нецярпеннем. Тузаюцца.

**Бабуля**. Пачакайце. Патрэбна ўсё рабіць, як паложана. Насця, давай сваю спадніцу.

Уваходзіць бацька.

**Бацька**. От, чую аж з павеці, як крычаць. Ну, давайце, паказвайцеся.

**Бабуля**. Сядайце ўсе. А ты, Сцяпан, дастань з Бажніцы грамнічную свечку ды ваду свянцоную.

**Маці**. Алеська, Янка, станьце каля Хроснай.

**Бабуля**. Пакладзіце, Хросная, адзенне на лаўку. (Бабуля мовіць прыгавор, абкурвае свечкай, пырскае вадой адзенне.) Ну, а зараз самае галоўнае.

**Алеська**. Я першая!

**Бабуля**. Не, спачатку Янка, затым ты.

Янка спачатку хапае сарочку, кладзе яе назад.

Пасля бярэ штаны, надзявае іх. Усе прысутныя з цікавасцю ўважліва назіраюць.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Бабуля**. Ну, а цяпер дзяўчынка.

**Бабуля**. А што першым надзяваць?

**Бабуля**. Сама думай.

Алеська апранаецца. Дзеці аглядаюць новую вопратку, на іх тварыках радасць. Яны ўжо нічога не заўважаюць.

**Янка**. Я пабягу на вуліцу!

**Бабуля**. Не. Зараз сядайце і слухайце. Цяпер вы ўжо не проста дзеці, вы хлопчык і дзяўчынка. І перш за ўсё вы павіны дапамагаць па гаспадарцы. Вучыцца ўсяму, што спатрэбіцца. Алеська — каля маці, Янка — каля бацькі. Бо не заўважыш, як трэба жаніцца, або замуж ісці. Вось ты, Янка, адзеў штаніну з правай нагі, а сарочку з правай рукі — гэта добрая прыкмета. Будзеш працавітым гаспадаром. А тое, што спачатку штаны надзеў, гаворыць аб тым, што моцна будзеш трымацца на зямлі і ў жыцці.

А ты, Алеська, таксама зрабіла ўсё правільна, каб быць добрай гаспадыняй. Правую руку ў сарочку спачатку надзела — добра будзеш жаць і пячы хлеб. Спаднічку праз галаву надзела — лёгка будзеш нараджаць дзетак.

Дзеці ўсміхаюцца, саромеючыся.

**Хросная**. Не смейцеся. Вось вам гасцінцы. Бяжыце, паказвайцеся, якія вы прыгожыя.

**Маці**. Ну, кума, дзякую Вам, што такія адзежыны прыгожыя пашыла.

**Бацька**. Ну, сапраўды, ужо на хлопца падобны Янка.

**Хросная**. То мой жа абавязак: ад нараджэння і пакуль не падружацца хрэснікаў даглядаць. Ну, давайце кашулькі, забяру іх, пакуль Бог не падорыць вам у хату наступных дзетак.

**Бабуля**. Ды ў спадніцу завяжы.

**Хросная**. А як жа, завяжу.

**Маці**. Дзякуй, табе, кума-галубка, за нашых дзетак. У час управіліся з абрадам прысвячэння. Вунь на вуліцы ўжо музыка чуецца. Сёння наша чарга пускаць у хату на вячоркі.

За сцэнай чуецца музыка, гучыць песня «Кудзеля»,
з якой у хату заходзіць фальклорны гурт з музыкамі.

Песня «Кудзеля».

**Маладзіцца 7**. Добры вечар таму, хто ў гэтым даму.

**Гаспадыня**. Міласці просім кожнага ў госці, хто да нас зойдзе — сабе справу знойдзе. Праходзьце, калі ласка, да нас на вячоркі.

**Гаспадар**. Сёння ў нашай хаце свята. Нашым дзеткам, слава Богу, споўнілася па 6 гадкоў, то ўжо і сарочкі з іх знялі: Янку ў штаны, Алеську ў спаднічку кума апранула.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Маладзіцца 2**. Ад шчырага сэрдца віншуем вас з абрадам прысвячэння. Дай Божа, каб вялікія ды здаровыя, працавітыя ды разумныя вашы дзеткі выраслі, каб славу вашаму роду прыняслі.

**Гаспадыня**. Дзякуй вам за добрыя пажаданні. Пачастуйцеся, калі ласка, пірагом нашым абрадавым.

**Маладзіца 3**. Ой, вельмі ж смачны пірог, дай вялікі які, каб у вашых дзетак жыццё такое доўгае было.

**Маладзіца 4**. Дый сытны. Салодкі. Дай Божа, каб жылі вашы дзеткі заможна.

**Маладзіца 5**. Дый круглы, як сонца. Дай Божа, каб у вашых дзетак век доўгі і шчаслівы быў.

Але ж, жанчынкі, мы не толькі частавацца з вамі на вячоркі прыйшлі, трэба справу рабіць. Дый яшчэ калі замуж пойдзеш на чужую старонку, то, здаецца, шэрай зязюляй да роднай матулі паляцела б.

Жанчыны працуюць. Гучыць песня «Зялёная вішня».

**Маладзіца з немаўляткам**. Добры вечар вам у хату. Ці можна да вас на вячоркі з немаўляткам, дома без мяне не пакінеш, а працаваць трэба.

**Гаспадыня**. То кладзіце яго ў калыску, яшчэ ад нашых дзетак засталася.

**Бабуля**. Я бачу ты яго, галубка, яшчэ грудзьмі корміш?

**Маладзіца з немаўляткам**. А як вы, бабуля, здагадаліся?

**Бабуля**. То на табе ж строй такі надзеты. Сарочка доўгая з карункам. Захоўвае ад сурокаў твае грудзі вышытыя калючыя ружы з бутонамі, разрэз на сарочцы да самага пояса.

**Маладзіца з немаўляткам**. Ото ж, вы ўсе па маім касцюме прачыталі, нібы ў кнігу глянулі.

**Бабуля**. А як жа па тым, у які строй апранута маладзіца можна сказаць, з якой яна мясцовасці, замужам ці дзяўчына яшчэ, ці ўдава — збіраецца браць новы шлюб.

**Маладзіца 10**. Гэта вельмі цікава. Вось мая суседка Агата. Ці яна зноў замуж збіраецца?

**Кума Агата**. Даўно я страціла свайго мужа. Таму і насіла касцюм удавіцы. Ці ў пост, ці ў свята вышывала яго толькі ніткамі сіняга і зялёнага колеру. Маленькія кветачкі раскіданы па полю фартуха нібы слёзкі.

**Маладзіца 10**. А зараз я бачу ў цябе ўжо і чырвоныя кветкі з'явіліся на вопратцы. Да чаго б гэта?

**Бабуля**. У гэтым ўся справа. Так было: аб намеры ўдавіцы абзавесціся новым мужам сведчыла ўвядзенне яркіх чырвоных фарбаў у кветкавы ўзор.

**Гаспадар**. Якая карова выйдзе з цялушкі, а якая жонка будзе з дзяўчыны — яшчэ невядома. А якая гаспадыня мая куміца-ўдавіца, што мае тры каровы, дый сама яшчэ кроў з малаком, то адразу відно, як у гэтай песні.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Песня «Кукавала зязюленька».

**Бабуля**. На вячорках хлопцы выбіралі сабе працавітых дзяўчат, бо тут адразу відно, хто якая майстрыха. Вунь як Якаў ля Тэклі ўвіхаецца. Заляцаецца.

**Якаў**. Бабуля, вы казалі, што на вопратцы ўсё «напісана». А ці я магу спадзявацца на мае заляцанні да Тэклі?

**Маладзіца 2**. То няхай яна сама табе аб гэтым скажа.

**Якаў**. Ды не гаворыць, толькі чырванее, як каліна. Вельмі сарамлівая ў мяне дзяўчына.

**Бабуля**. Строй у Тэклі вышыты парнай вышыўкай па дзве аднолькавыя кветкі на тканіне, нібы хлопец з дзяўчынай парай. Колер кветак толькі цёплых адценняў, што сведчыць аб жаданні кахаць і быць каханай. Аб намеры дзяўчыны ўзяць шлюб гавораць і парна вышытыя каласы, жытні колас абазначае здароўе, пладавітасць, багацце абраніцы.

Песня «Пасадзіла Тэкля гарбузы».

**Маладзіца 8**. Ой, не кажыце, жаначкі, добра замужам ці дрэнна, а толькі бабы каюцца, а дзеўкі замуж збіраюцца. А дзе б знайсці такога мужа, каб не піў, не курыў, падарункі дарыў. Як той Лявон Лявонісе.

Танец «Лявоніха» з прыпеўкамі.

**Маладзіца 3**. Ну і гаспадыня ў нас спраўная, што сказаць, што скакаць! Што ў печы згатаваць, ці ў хаце прыбраць!

**Маладзіца 1**. Э-э-э. Не кепская гаспадыня! А вось паслухайце пра якую я вам зараз раскажу. Тут у мяне куміца Ганна.

**Маладзіца 3**. Гэта тая, што з Загорын у Прудок замуж за Андрэя Валетавага пайшла?

**Маладзіца 1**. Ага, тая самая Ганна. Жнівень прыйшоў, трэба жыта жаць, а палоска ў іх далёка была. Пасадзіў Андрэй жонку на воз, а яна туды разанку сала, збан мёду, посцілку, падушкі паклала. Прыехала, выгрузілі ўсё з возу. Ганна пакуль Андрэй на полі быў, жне, завіхаецца, а як паехаў гаспадар, дык яна ў цяньку посцілку разаслала, падушкі паклала, разанку сала ўклала, дый мядком запіла. Наелася, напілася, дый спаць завалілася. Спіць, ажно рухкае, нават не чуе як яе салодкую пчолкі абляпілі. Ганна ў сне рукой махнула, а пчолка яе і джыганула. Твар адразу распух, вочы, як шчыліны, парабіліся. Куды ж хворай Ганне жаць — давай яна далей спаць. Надвячоркам Андрэй прыехаў, ажно глядзіць палоска ў іх не зжатая стаіць, а гаспадыня ў цяньку храпіць. Раззлаваўся мужык, падушкі ўспароў, пер’е рассыпаў, а яно на салодкі мядок да Ганны прыляпілася — сапраўднае цуда ў пер’ях атрымалася. А гаспадынька нават не прачнулася. Плюнуў Андрэй, дый дадому паехаў, упраўляцца ж па гаспадарцы трэба. А кароўка ў іх з норавам была. Папрасіў кум Андрэй мяне яе падаіць. Я кароўку падаіла, свінак пакарміла, вячэру згатавала. Селі за стол: я, мой чала-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

век, кум Андрэй з дзеткамі — вячэраем. А дзе Ганна падзелася, Андрэй не кажа. Калі ж чуем — нехта ў акенца шкрабаецца, а ўжо змяркалася. Дзеці ў шыбку глянулі, ды як закрычаць: «А вой, а вой. Там пужака стаіць! Замест галавы гарбуз без вачэй, уся пер'ем абрасла».

«Гаспадар, а твая жонка дома?» — пытаецца цуда-юда.

«Дома, дома, — кажа Андрэй, — вунь гаспадарку дагледзела, вячэру згатавала».

«Вой, — а чыя ж то буду я?»

Тут толька па голасу і пазналі, што то Ганна была.

**Маладзіца 3**. Дык ці пусціў Андрэй яе ў хату?

**Маладзіца 1**. Пусціў, пусціў, а дзе ж ты дзенешся. Але так злекаваў гультайку, што навечна адвучыў лынды біць.

**Мікіта**. Так, так, добрую жонку трэба самому выхоўваць і розныя лекі для гэтага ведаць.

**Мікіціха**. Мо такія, якімі малдаван сваю жонку лекаваў?

Песня «Як паехаў малдаван».

**Мікіта**. А вось мая Мікіціха добрая, лагодная, да кума не ходзіць, шкоду не робіць, кароўку падоіць, вяршкі назбірае, дый масла збівае.

**Маладзіца 6**. То-та, ты, Мікіта, на масліцы ад'еўся, карак аж блішчыць, як ў ката...

**Мікіціха**. Толькі што карак наядае, а мяне не даглядае.

**Мікіта**. Кажаш, што я нічога не здолею, а я і цябе і куму падолею.

Жанчыны падзадорваюць.

**Маладзіца 6**. А-ну Мікіта, пакажы, што твая світа не лыкам шыта. А сам ты спраўны, мужык ўпраўны.

Танец «Мікіта».

**Мікіта**. Бач, Мікіціха, на што я годны!

**Мікіціха**. Вой, я думала, што мой Мікіта, нічога не здолее, а ён яшчэ і вала падолее.

**Маладзіца 7**. Вы, мае галубачкі, за скокамі і пра справу забыліся.

**Бабуля**. Я бачу вы, Грыпіна, з дачкой ужо пасцяныя касцюмы надзелі. Бач як шчодра грудзіну і рукаў расшылі.

**Маладзіца 4**. То ў пост многа ж трэба працаваць, каб у грудзях не балела, каб захаваць ад сурокаў галоўную «прыладу працы» жанчыны — руку, так багата і пасцяны строй вышылі, як наша бабуля наказвала.

**Маладзіца 7**. З песняй і праца лепей спорыцца. Давайце заспяваем старажытную дуброўную песню пра валы.

Песня «Як пагнала дзеўка валы ў дуброву».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Гаспадыня**. Вось і скончана работа, час прыйшоў скакаць «Суботу».

Беларускі побытовы танец «Субота».

**Кума Агата**. Ой, кумка Насця ў мяне лоўкая, як лёгенька скача. Дарма, што ўжо цяжарная.

**Гаспадыня**. А як ты, Агата, здагадалася, што дзіцятка чакаю: па мне нічога ж яшчэ не відно.

**Кума Агата**. То на табе фартух вышываны па ўсяму полю калючымі ружамі з бутонамі, як абярэг для будучага дзіцяці. І грудзіна на сарочцы шчодра вышыта, каб потым у грудзях дастаткова было малака.

**Бабуля**. Вось і вы ўжо, мае галубкі, навучыліся па вопратцы «чытаць».

Яшчэ мая бабуля хацела быць пахаванай ва ўборы сваёй маладосці, каб паводле яе прыгожай фантазіі, продкі пазналі «хто яна, хто мы, як народ». Пакуль мы будзем насіць свае прыгожа вышытыя паляшуцкія строі, спяваць народныя мілагучныя песні, танцаваць танцы нашых продкаў, пакуль у нашых хатах будуць ладзіцца вяселлі, радзіны, — мы будзем жыць, як народ.

**Кума Агата**. Дай Божа, даждаць, ды ў гэтай хаце радзіны і вяселлі спраўляць.

**Маладзіца 4**. Дзякуй вам, гаспадары, за вячоркі. А нам ўжо да хаты пара. Да пабачэння.

З прыпеўкамі выходзяць з хаты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ